Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 КРАСАВІКА 2023 г.
СЕРАДА
№ 69 (29949)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

КОНТРУДАР НА ДНЯПРЫ — ЛЕГЕНДАРНАЯ ВАЙСКОВАЯ АПЕРАЦЫЯ 4-5

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ СТАРЫХ ПАБУДОЎ

МС

КАРОТКА

- **Знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг Беларусі ў студзені-лютым склаў $14,8 млрд.**
- Хлебаробы Віцебскай вобласці далі старт пасяўной.
- **Цэнтралізаваныя іспыты для выпускнікоў Беларусі будуць праходзіць 14 і 21 мая.**
- У Гродне стартавала акцыя «Аднаўленне святынь Беларусі. Нас аб'ядноўвае гісторыя і вера».
- **НАН аб палёце беларускага касманаўта: дзве жанчыны адабраны, навуковая праграма падрыхтавана.**
- У Мінпрыроды нагадалі аб забароне на выпальванне сухой расліннасці і сельгаспалы.
- **Дзмітрый Квартальнаў стаў галоўным трэнерам хакейнага мінскага «Дынама».**

ЦЫТАТА ДНЯ

Пётр ПАРХОМЧЫК, намеснік Прэм'ер-міністра:

«Кіраўнік дзяржавы высока ацэньвае навуку і заўсёды адзначае важнасць максімальна хуткага ўкаранення яе дасягненняў у эканоміку краіны. Развіццё айчыннага аўтамабілебудавання — адна з прыярытэтных задач. Кіраўніцтва ўрада нацэльвае навуковую сферу на стратэгічнае бачанне машынабудавання, у тым ліку аўтамабільнай галіны».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«УСЕ ПАВІННЫ СТВАРАЦЬ ПРАДУКТ ДЛЯ ПАТРЭБ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЭКАНОМІКІ»

Новы імпульс развіцця айчыннай ІТ-сферы разгледзелі на нарадзе з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Дзейнасць Парка высокіх тэхналогій з улікам сітуацыі, што склалася вакол Беларусі, ужо абмяркоўвалі на ўзроўні кіраўніка дзяржавы ў лістападзе мінулага года. Цяпер на разгляд Прэзідэнта ўнесены праекты прававых актаў аб развіцці ПВТ, у якіх закладзены нестандартны падыход.

Фота БелТА.

«Неабходна надаць новы імпульс развіццю галіны, забяспечыць максімальна спрыяльныя ўмовы работы. Мы аб гэтым дамовіліся. Прычым не толькі для рэзідэнтаў ПВТ, але і для ўсіх айчынных ІТ-кампаній. Увогуле для ўсіх айцішнікаў. Усе павінны стварацьпрадукт для патрэб нацыянальнай эканомікі і, канешне, на экспарт. Задача сур'ёзная. Але ў апошнія некалькі гадоў у нас і не бывае лёгкіх», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

НАШ ПРАКАВЕТНЫ АБЯРЭГ

Мінчанка Ганна КЛІМОВІЧ размалёўвае велікодныя яйкі. Не проста малюе — піша на іх старажытныя абярэжныя сімвалы, якія складаюцца ў цудоўныя карункі. У славянскіх народаў, у тым ліку ў Беларусі, існуюць некалькі відаў фарбавання яек падчас Вялікадня — крашанка (у адным колеры, пераважна чырвоным), маляванка (адвольны малюнак, напрыклад, птушкі альбо жывёлы) і пісанка (абрадавы строгі роспіс на «жывым» (сырым) яйку). Ганна захапляецца менавіта апошнім — гэтым архаічным узорам-роспісам, які перадае глыбокую інфармацыю пра сэнс жыцця, пашырае веды пра Сусвет і вяртае да вытокаў.

СТАР. 16

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З нагоды

«Быць даследчыкамі касмічнай прасторы — гэта гуляць у вышэйшай лізе»

Вучоныя расказалі пра беларускія спадарожнікі і жанчыну-касманаўта, якая адправіцца на МКС

Беларусь у найбліжэйшыя гады запусціць некалькі сваіх спадарожнікаў, якія дазволяць вырашаць самыя розныя задачы: ад маніторынгу сітуацыі вакол атамнай станцыі да ранняга выяўлення захворванняў лесу. Ужо сёння ўласныя спадарожнікі прыносяць практычную карысць, у прыватнасці, дазваляюць выявіць анамальнае павышэнне тэмпературы і загаранне, дзякуючы чаму адпаведныя службы імгненна рэагуюць і прымаюць меры. Таму вялікіх лясных пажараў на тэрыторыі нашай краіны ў апошнія пяць гадоў не назіралася.

Напярэдадні Сусветнага дня авіяцыі і касманаўтыкі, які адзначаецца сёння, эксперты расказалі, як беларускія навукоўцы ўдзельнічаюць у касмічных даследаваннях і калі беларускі касманаўт адправіцца на МКС.

СТАР. 3

«УСЕ ПАВІННЫ СТВАРАЦЬ ПРАДУКТ ДЛЯ ПАТРЭБ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЭКАНОМІКІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён падкрэсліў, што цяпер наш ПВТ, які доўгі час аўтарытэтныя спецыялізаваныя выданні называлі «раем для праграмістаў» і «крамянёвай далінай Усходняй Еўропы», хочуць задушыць эканамічна. Такія спробы робяцца.

«Што ж, мы прывыклі прымаць падобныя выклікі і годна адказваць на іх. Не хочуць нас бачыць у адной частцы планеты — мы ідзём у другую частку», — падкрэсліў беларускі лідар. Па яго словах, прадстаўленыя нарматыўныя акты вылучаюцца нестандартным падыходам. Але, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, у гэтай сферы практычна заўсёды патрабуюцца крэатыўныя рашэнні.

«Хачу падкрэсліць, што гаворка ідзе пра другое дыханне і раней недаступныя гарызонты для Парка і ўсёй беларускай ІТ-галіны. Трэба асвоіць новыя рынкі, замясціць заходнія інвестыцыі азіяцкімі. Калі недзе ствараецца дастойны прадукт, якія б ні былі перашкоды, яго купяць», — заявіў ён.

Прэзідэнт пацікавіўся ў адказных за гэту сферу, як можна максімальна паскорыць работу па прывядзенні нарматыўнай базы ў адпаведнасць з прынятымі рашэннямі, і спытаў, калі будзе атрыманы канкрэтны вынік.

«Хачу папярэдзіць, я пра гэта казаў у пасланні ўраду, і кіраўніцтву Парка высокіх тэхналогій, і ўсім тым, хто мае да гэтага дачыненне. Проста пад плінтусам адсядзецца не атрымаецца. Патрэбны вынік. Калі няма выніку, ніякія тлумачэнні не прымаюцца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ **У тэму**

«Беларускія кампаніі канкурэнцыяй не спалохаеш»

У размове з журналістамі **дырэктар Адміністрацыі ПВТ Усевалад ЯНЧЭЎСКІ** расказаў, што Прэзідэнт падтрымаў унесеныя яму на разгляд праекты прававых актаў аб развіцці Парка высокіх тэхналогій.

«Сёння наша беларуская ІТ-сфера знаходзіцца не ў самым простым становішчы. Зразумелыя ўсе рызыкі, выклікі і праблемы, звязаныя з сітуацыяй вакол нашай краіны. Яны не вельмі прыемныя, але абсалютна відавочныя. На краіну і ІТ-сектар ціснуць, і гэта стварае пэўныя праблемы. Да таго ж у глабальным ІТ-сектары таксама ёсць крызіс, назіраецца падзенне капіталізацыі многіх кампаній, вялікія скарачэнні нават у самых сур'ёзных ІТ-карпарацыях. Адны праблемы накладаюцца на іншыя. І таму сёння ІТ-кампаніям даводзіцца вельмі няпроста. Кіраўнік дзяржавы чарговы раз традыцыйна выказаў падтрымку, прычым не проста словамі, а справамі і рашэннямі нашаму ІТ-сектару, Парку высокіх тэхналогій», — адзначыў ён.

Усевалад Янчэўскі выказаў спадзяванне, што і ад ІТ-сектара будзе сустрэчны рух. Па яго словах, ён вельмі просты. Перш за ўсё трэба, каб Парк высокіх тэхналогій і надалей прыносіў карысць эканоміцы, краіне і, нягледзячы на ўсе цяжкасці, трымаў высока планку не толькі ў краіне, але і ў свеце, як гэта было ўсе гады.

На нарадзе ў Прэзідэнта, апрача агульных тэм у ІТ, абмяркоўваліся і тэндэнцыі ў развіцці тэхналогій штучнага інтэлекту і перспектывы беларускіх кампаній у гэтай прагрэсіўнай галіне. Як адзначыў кіраўнік ПВТ, у Беларусі ёсць шмат кампаній, у тым ліку стартапаў, якія ў гэтай сферы спецыялізуюцца і яшчэ пакажуць сябе. «Думаю, што тыя рашэнні, якія Прэзідэнтам прымаліся, прымаюцца і будуць прымацца, падтрымаюць не толькі ў цэлым ІТ-сферу і ПВТ, а ў тым ліку і тое, што датычыцца адной з найбольш перспектыўных і значных на сёння абласцей, такой як штучны інтэлект», — сказаў Усевалад Янчэўскі.

Кіраўнік ПВТ заўважыў, што ўжо шмат гадоў запар Парк спрабуюць «пахаваць». Безумоўна, праблемы ёсць. Але, па словах Усевалада Янчэўскага, ПВТ існуе, яго рэзідэнтамі становяцца новыя кампаніі, дзясяткі тысяч праграмістаў працуюць у Беларусі. «Парк уносіць важкі ўклад у экспарт і ВУП, у эканоміку краіны. І я думаю, што тыя праблемы будуць вырашаны і ў Парка будзе другое, трэцяе дыханне», — падкрэсліў ён.

У пацвярджэнне сваіх слоў ён прывёў адметны факт: «Нягледзячы на ўсе крызісныя з'явы, ёсць вельмі цікавы паказчык: за некалькі месяцаў гэтага года кампаніі ПВТ заплацілі больш падаткаў, чым у мінулым годзе (за аналагічны перыяд з улікам ільготнага рэжыму, які распаўсюджваецца на рэзідэнтаў ПВТ)», — расказаў Усевалад Янчэўскі. Паводле даных кіраўніцтва Парка, за ўвесь 2022 год экспарт кампаній ПВТ склаў каля $2,5 млрд, а падатковыя выплаты — 750 млн бел. руб.

Кіраўнік ПВТ таксама выказаў упэўненасць, што на новыя азіяцкія рынкі нашы кампаніі будуць заходзіць паспяхова, таму што ў іх ёсць вопыт работы ў самых жорсткіх і складаных умовах. «Беларускія кампаніі канкурэнцыяй не спалохаеш, таму што ўсе гады, колькі існуе Парк, яны працуюць у вельмі жорсткіх канкурэнтных умовах. У ІТ-сферы канкурэнцыя дакладна адна з самых жорсткіх. Беларускія кампаніі заўсёды працавалі на прэміяльных і вельмі патрабавальных рынках — амерыканскім, еўрапейскім...» — растлумачыў ён.

«Жанчыны і дзеці — прыярытэт прыярытэтаў»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з першай лэдзі Зімбабвэ Аксіліяй Мнангагва. Жонка Прэзідэнта Зімбабвэ знаходзіцца з візітам у Беларусі ў развіццё дамоўленасцяў кіраўнікоў дзяржаў аб супрацоўніцтве ў гуманітарнай галіне. У прыярытэце — сфера мацярынства, дзяцінства, ахова здароўя, дзіцячае харчаванне. Аксілія Мнангагва наведала шэраг прадпрыемстваў і арганізацый Міністэрства аховы здароўя, ААТ «Беллакт» у Гродзенскай вобласці, правяла сустрэчы ў Міністэрстве замежных спраў, па лініі Беларускага саюза жанчын, пабывала ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

«Я выконваю просьбу майго сябра Прэзідэнта Эмерсана, каб тыя тэхналогіі, якія сёння запатрабаваны ў вас у Зімбабвэ, там знаходзіліся. І мы гатовы дапамагчы вам рэалізаваць некалькі праектаў па жаданні вашага боку і вашага Прэзідэнта па будаўніцтве высокатэхналагічных прадпрыемстваў, перш за ўсё ў гуманітарнай сферы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, вітаючы госцю. Ён расказаў, што Эмерсан Мнангагва прасіў яго дапамагчы стварыць у Зімбабвэ сістэму, аналагічную беларускай па родадапамозе, дапамозе нованароджаным і вырашыць праблему дзіцячага харчавання.

«Словам, жанчыны і дзеці — прыярытэт прыярытэтаў, пра што мне казаў неаднойчы Эмерсан падчас майго візіту ў вашу краіну. І ён мне абяцаў, што гэтымі праграмамі, іх рэалізацыяй будзе займацца вельмі адказны чалавек. Шчыра кажучы, я яго папрасіў, каб гэта былі вы. Дзверы былі адчынены ўсюды. Выбірайце, вызначайцеся, пачынайце дзейнічаць», — сказаў беларускі лідар. Ён таксама падкрэсліў, што па просьбе Эмерсана Мнангагва пераговарыў у Эміратах і Расіі наконт рэалізацыі сумесных праектаў. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ні па адным з кірункаў не было адмовы. Гэтыя дзве краіны вельмі зацікаўлены ў супрацоўніцтве з афрыканскімі дзяржавамі і перш за ўсё Зімбабвэ.

«Аксілія, вы павінны разумець, тэхналогій у нас хапае. Усё астатняе ў вас ёсць. Галоўнае цяпер — жаданне і хуткасць. Трэба хутка ўсё гэта рабіць», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ **У тэму**

«АДЧУВАЛА СЯБЕ ЯК ДОМА»

У размове з журналістамі **Аксілія МНАНГАГВА** назвала сустрэчу з Прэзідэнтам Беларусі вельмі цёплай і плённай. «Паміж намі не было ні адной закрытай тэмы. Я адчувала сябе як дома, мы абмяркоўвалі абсалютна ўсё. І цяпер я бачу, што наша супрацоўніцтва будзе ісці наперад, таму што ў Прэзідэнта ёсць адна важная якасць, якая ёсць у нас, — ён умее працаваць цяжка і доўга. Падчас сустрэчы з Прэзідэнтам я сказала яму, што ён для сваёй краіны не толькі бацька, але і маці. Таму што я ўбачыла, які клопат ён праяўляе аб сваёй краіне, аб сваім народзе. Мы бачылі, як ён клапоціцца аб дзецях у бальніцах. Яго візіт у нашу краіну быў сапраўды гістарычным. Мы былі вельмі рады прымаць Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Зімбабвэ», — падзялілася Аксілія Мнангагва. На сустрэчы з кіраўніком дзяржавы абмяркоўвалася супрацоўніцтва ў разнастайных сферах: гэта медыцына, сельская гаспадарка, горназдабыўная галіна, ад кожнай з якіх залежыць якасць жыцця людзей.

«Так, я прыехала сюды як першая лэдзі сваёй краіны. Але я таксама прыехала сюды і як маці, якая добра ведае, што адбываецца ў сем'ях і як жанчыны ў маёй краіне клапоцяцца аб сваіх сем'ях», — сказала Аксілія Мнангагва. На сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі абмяркоўваліся таксама праграмы абмену і магчымасці навучання зімбабвійскіх спецыялістаў у беларускіх медыцынскіх ВНУ, у галіне сельскай гаспадаркі. Па словах першай лэдзі Зімбабвэ, краіне патрэбна абсталяванне, але таксама патрэбны і спецыялісты.

Аксілія Мнангагва выказалася за актыўныя кантакты паміж бізнес-коламі дзвюх краін, узаемныя візіты для вывучэння магчымасцяў супрацоўніцтва і пошуку новых партнёраў. «Наша краіна (*Зімбабве.* — **«Зв.»**) атрымае ад гэтага вялікую карысць. Таму што для нас Беларусь — гэта гігант», — сказала яна.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Краіны БРІКС абышлі G7 па эканамічных паказчыках

Паводле даных брытанскага даследчага агенцтва Acorn Macro Consulting, аб'яднанне БРІКС, у якое ўваходзяць Бразілія, Расія, Індыя, Кітай і Паўднёвая Афрыка, цяпер мае большую эканамічную вагу, чым дзяржавы G7. І гэта пры тым, што ў «сямёрку» ўваходзяць такія краіны, як Вялікабрытанія, Германія, Італія, Канада, Францыя, Японія і ЗША, што лічацца самымі развітымі на планеце ў прамысловым плане. Сёння краіны БРІКС забяспечваюць 31,5 працэнта сусветнага ВУП, у той час як дзяржавы G7 — 30,7 працэнта, паведаміла французскае выданне Le Journal du Dimanche. Чакаецца, што эканамічны рост краін аб'яднання ў найбліжэйшыя гады працягнецца. Цяпер многія дзяржавы зацікаўлены ў далучэнні да БРІКС. У прыватнасці, аб сваіх намерах далучыцца да «пяцёркі» аб'явілі Саудаўская Аравія, Мексіка, Нігерыя, Венесуэла і Іран. У мінулым годзе ў МЗС Кітая заявілі, што Пекін запрасіў Казахстан, Саудаўскую Аравію, Аргенціну, Егіпет, Інданезію, Нігерыю, Сенегал, ААЭ і Тайланд далучацца да дыялогу з БРІКС.

У Вялікабрытаніі звыш 45 тысяч урачоў-інтэрнаў праводзяць чатырохдзённую забастоўку

Арганізатарам стачкі выступае Брытанская медыцынская асацыяцыя (BMA), паведамляе тэлеканал Sky News. Усяго ў забастоўцы прымуць удзел да 47,6 тысячы медыкаў, а гэта звыш 40 працэнтаў ад штата медработнікаў Нацыянальнай службы аховы здароўя (NHS). Галоўнае патрабаванне забастоўшчыкаў — павышэнне заработнай платы на 35 працэнтаў. BMA паведаміла, што заробак урачоў-інтэрнаў упаў на 26 працэнтаў за апошнія 15 гадоў, а медыкі, якія нядаўна атрымалі кваліфікацыю, зарабляюць менш, чым барыста ў кавярні. Урад называе гэтыя патрабаванні «непамерна высокімі». Па ацэнках HNS, з-за нявыхаду на працу медыцынскіх супрацоўнікаў каля 250 тысяч прыёмаў і аперацый могуць быць адкладзеныя. Сітуацыя пагаршаецца з-за велікодных канікулаў. Гэта можа прывесці да таго, што многія з медыцынскіх работнікаў, якія выходзілі на замену страйкуючаў падчас аналагічнай 72-гадзіннай стачкі ў сакавіку, гэтым разам не змогуць прыйсці на дапамогу. Папярэдняя забастоўка ўжо прывяла да адмены 175 тысяч прыёмаў ва ўрача і аперацый. Кіраўнік канфедэрацыі NHS Мэцью Тэйлар заклікаў жыхароў краіны берагчы сябе і не рызыкаваць дарма, бо ў выпадку сур'ёзных праблем яны не змогуць атрымаць неабходную медыцынскую дапамогу.

У ЗША з пачатку года адбылося 146 выпадкаў масавай стральбы

У Злучаных Штатах сёлета зафіксавана як мінімум 146 выпадкаў масавай стральбы. Такія даныя прывяла даследчая арганізацыя Gun Violence Archive, паведаміла ТАСС. Адзін з апошніх выпадкаў масавай стральбы адбыўся днямі ў горадзе Луісвілі. 23-гадовы Конар Стэрджэн адкрыў агонь у будынку банка. У выніку чатыры чалавекі загінулі. Згодна са статыстыкай, у мінулым годзе ахвярамі інцыдэнтаў са стральбой у Злучаных Штатах сталі звыш 43,6 тысячы чалавек, у тым ліку 1,6 тысячы дзяцей. Больш за 37,9 тысячы чалавек атрымалі раненні, у тым ліку 4,4 тысячы дзяцей. Як вядома, жыхары ЗША маюць права на валоданне агнястрэльнай зброяй. У краіне неаднаразова ўзнімалася пытанне аб неабходнасці абмежаваць гэтае права.

Добрая справа

Пасадзіць сваё дрэва

Кіраўнік Брэсцкай вобласці Юрый ШУЛЕЙКА ўзяў удзел у рэспубліканскай акцыі «Тыдзень лесу»

Працоўны дэсант Брэсцкага аблвыканкама на чале з губернатарам на пасадку лесу накіраваўся ў Мухавецкае лясніцтва Брэсцкага лясгаса. А перад гэтым удзельнікі мерапрыемства азнаёміліся з работай гандлёвай пляцоўкі названага лясгаса, якая нядаўна распачала работу, дарэчы, першая ў рэгіёне.

Пляцоўка адкрылася ў студзені і ўжо выклікала цікавасць з боку як прадстаўнікоў будаўнічага бізнесу, так і простых грамадзян. Тут можна набыць усё, каб узвесці зруб новага дома, альбо купіць гатовыя лазню, альтанку, арэлі, нават кошыкі. Шмат яшчэ якой прадукцыі прапануюць без пасрэднікаў. І ўсё гэта зроблена з драўніны, што расце ў нашых лясах.

Менавіта каб лясы раслі, а на месцы планавых высечак узнімаліся новыя дзялянкі, праводзяцца падобныя кампаніі. У 35-м квартале Мухавецкага лясніцтва каля вёскі Закій быў падрыхтаваны фронт работ. Тут працоўная брыгада абласнога выканкама і высадзіла сеянцы хваёвых парод. Надвор'е было цёплае, сонечнае. Старшыня аблвыканкама падзяліўся сваімі ўражаннямі з журналістамі:

— Добра, што нашы землі выкарыстоўваюцца рацыянальна, і сёння мы робім уклад, каб пакінуць будучым пакаленням прыгожую краіну з зялёнымі лясамі, — сказаў Юрый Шулейка. — Садзіць лес стала добрай традыцыяй. Брастаўчане бяруць удзел у рэспубліканскай акцыі «Тыдзень лесу» з 2007 года. І з кожным годам удзельнікаў становіцца больш. Падлічана, што за гэты час валанцёрамі высаджана 29 мільёнаў штук пасадачнага матэрыялу на плошчы 6,8 тысячы гектараў. Удзел у акцыі ўзяло каля 88 тысяч чалавек. Такія мерапрыемствы становяцца святам.

Акцыі штогод праводзяцца і ў гарадах, калі мы садзім ліпы, каштаны, бэз. Гэта таксама своеасаблівы тыдзень лесу для ўпрыгожання гарадоў, — заўважыў губернатар.

— Пасадка дрэва — вельмі сімвалічная акцыя, — працягнуў гаворку **старшыня абласнога Савета дэпутатаў Юрый НАРКЕВІЧ.** — Калі садзіш дрэва, тым самым працягваеш жыццё, бо карані — гэта мінулае, ствол — сучаснасць, а крона — будучае. Ва ўсім тым вялікі сэнс. Таму асабліва важна, калі сюды прыходзяць людзі з калегамі па рабоце, з аднадумцамі і сябрамі па грамадскай арганізацыі, прадстаўнікі пакаленняў адной сям'і. Лясгасы даюць магчымасць паўдзельнічаць у добрай справе кожнаму. А папрацаваць разам на свежым паветры — гэта ж асабліваe задавальненне.

Гэтай вясной у Брэсцкай вобласці запланавана пасадзіць лес на плошчы 2,6 тысячы гектараў. Падчас акцыі, якая працягнецца да 23 красавіка, добраахвотнікі засадзяць прыкладна 1,5 тысячы гектараў. Пры выбары лакацый перавагу аддавалі дзялянкам паблізу населеных пунктаў, каб людзям было зручна дабірацца. Многія ж прыходзяць цэлымі сем'ямі, з дзецьмі, унукамі.

— Летась на гэтую пару ў рамках Тыдня лесу мы пасадзілі каля тысячы гектараў, а сёлета ўжо ёсць паўтары тысячы, — сказаў **генеральны дырэктар Брэсцкага лесагаспадарчага аб'яднання Анатоль ЛЕВАНЮК.** — Гэта не значыць, што ў нас не хапае людзей, рэсурсаў. Мы і самі справіліся б з такім аб'ёмам работ. Але ж акцыя дае магчымасць прыцягнуць увагу шырокай грамадскасці да праблемы захавання і аднаўлення лясоў. Калі чалавек пасадзіў сваё дрэва, ён па-іншаму будзе ставіцца да лесу наогул, з большымі любоўю і павагай. У Год міру і стваральнай працы, думаю, пасадзіць дрэва — асабліва ганарова.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Будзь у курсе!

Дадатковыя цягнікі на святы

Іх колькасць павялічылася за 250

У мэтах павышэння якасці паслуг і з улікам наяўнага попыту на перавозкі пасажыраў да ўжо прызначаных раней на красавіцкія і майскія святы дадатковых цягнікоў з 29 красавіка да 10 мая прызначана яшчэ больш як 120 цягнікоў міжрэгіянальных і міжнародных ліній, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.

У міжрэгіянальных зносінах цягнікі будуць курсіраваць па найбольш запатрабаваных у пасажыраў напрамках: Мінск — Брэст, Мінск — Гомель, Мінск — Віцебск, Мінск — Гродна, Мінск — Магілёў, Мінск — Пінск, Гомель — Брэст, Гродна — Орша — Крычаў, Віцебск — Орша — Гродна, Мінск — Камунары, Камунары — Орша — Гродна.

У міжнародных зносінах ва ўзаемадзеянні з ААТ «Расійскія чыгункі» прызначаны дадатковыя цягнікі для праезду арганізаваных груп і індывідуальных пасажыраў па маршрутах: Мінск — Масква, Мінск — Санкт-Пецярбург, Брэст — Масква, Полацк — Масква, Смаленск — Санкт-Пецярбург.

Таксама, у залежнасці ад попыту на перавозкі, будзе павялічана колькасць месцаў для праезду пасажыраў у рэгулярных цягніках.

Работа па прызначэнні дадатковых цягнікоў працягваецца. Больш падрабязную інфармацыю аб прызначаных дадатковых цягніках і часе іх адпраўлення можна атрымаць на сайце www.rw.by, у мабільным дадатку «БЧ. Мой цягнік», а таксама па тэлефоне 105 Кантакт-цэнтра БЧ.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«Быць даследчыкамі касмічнай прасторы — гэта гуляць у вышэйшай лізе»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Акадэмік-сакратар аддзялення фізікі, матэматыкі і інфарматыкі НАН Беларусі Аляксандр ШУМІЛІН нагадаў, што наша краіна заўсёды актыўна ўдзельнічала ў касмічных даследаваннях. У 2012 годзе Беларусь стала касмічнай дзяржавай, запусціўшы свой касмічны апарат, якім кіруе і сёння. Для гэтага было рэалізавана шэсць праграм Саюзнай дзяржавы. Сумесна з расійскімі вучонымі іх рэалізавана ўжо сем і прыняты яшчэ дзве. Таксама разам з кітайскімі калегамі беларусы запусцілі свой спадарожнік сувязі, а ў 2018 годзе быў запушчаны трэці спадарожнік, ён спраектаваны і выраблены студэнтамі.

Зараз беларусы сумесна з расійскімі вучонымі працуюць над праектаваннем і вырабам новых спадарожнікаў. Адзін з іх з раздзяленнем 0,5 метра будзе запушчаны ў найбліжэйшай перспектыве. Другі — са звышвысокім раздзяленнем 0,35 метра — цягам 5-6 гадоў. Адметна, што такіх тэхналогій, па словах Аляксандра Шуміліна, у свеце пакуль няма. Сёлета ці ў наступным годзе плануецца запусціць і другі студэнцкі спадарожнік.

Акрамя таго, у Акадэміі навук прыступаюць да распрацоўкі тэхналогій запуску мікраспадарожнікаў.

— Гэта спадарожнікі на невысокай арбіце для адпрацоўкі розных тэхналогій і маніторынгу, у тым ліку стану вакол атамнай станцыі — запатрабаваная тэхналогія для вырашэння эканамічных задач, — адзначыў Аляксандр Шумілін.

Па ініцыятыве Прэзідэнта будзе асвойвацца і новы кірунак у галіне касмічных даследаванняў — пілатаваныя касмічныя палёты. У іх возьме ўдзел першая беларуская жанчына-касманаўт.

— Бываюць розныя спецыяльнасці: касманаўт-урач, касманаўт-выпрабавальнік, а ў нас будзе беларускі касманаўт-даследчык. Падрыхтавана праграма навуковых даследаванняў. Усе асноўныя працэдуры выкананы, дзве жанчыны адабраны, — расказаў Аляксандр Шумілін.

Як дадаў **начальнік упраўлення аэракасмічнай дзейнасці апарату НАН Беларусі, намеснік кіраўніка Агенцтва па касмічных даследаваннях НАН Пётр ВІЦЯЗЬ,** кандыдаты прайшлі адбор. Выбрана, хто — асноўны, хто — дадатковы. Цяпер задача — вывучыць распрацаваную ў Акадэміі навук навуковую праграму. Як толькі тэрміны будуць узгоднены з «Раскосмасам», яны паедуць на падрыхтоўку непасрэдна да палёту.

Аляксандр Шумілін таксама расказаў, чым беларускі касманаўт будзе займацца на арбіце:

— Несумненна, будзе праводзіць выпрабаванні і даследаванні нашай апаратуры «Сава», якая распрацавана ў сістэме Мінадукацыі. Адпраўляючы свайго касманаўта, мы імкнёмся, каб ён выкарыстоўваў абсталяванне, спраектаванае і выраблене ў Беларусі, для назірання за Зямлёй з космасу.

Паводле яго слоў, актуальныя таксама даследаванні верхніх пластоў атмасферы, лясоў.

— У Беларусі больш за 40 працэнтаў тэрыторыі пакрыта лясамі. Унізе не заўсёды можна распазнаць, калі пачынаецца іх захворванне. Тэхналогіі даюць магчымасць убачыць з космасу магчымыя захворванні і, адпаведна, прыняць своечасовыя рашэнні, — адзначыў Аляксандр Шумілін.

Мае наша краіна поспехі ў стварэнні новых кампазіцыйных матэрыялаў і сістэм аховы для мікраэлектронікі.

— Наш беларускі спадарожнік лятае ўжо больш за 10 гадоў. Стандартныя тэрміны эксплуатацыі для космасу — 5 гадоў. Іх мы пераўзышлі ў два разы. Такім чынам, спраектаванае і выраблене ў Беларусі абсталяванне ўжо паказала свою надзейнасць. Дарэчы, адна з рэалізаваных саюзных праграм была прысвечана павышэнню надзейнасці і жывучасці касмічнага апарата. Космас — гэта жорсткія рызыкі. Перапады тэмператур на паверхні касмічнага апарата могуць даходзіць да 200 градусаў, далёка не ўсе прыборы могуць вытрымліваць такія змяненні. Важная і магнітная абароненасць. Нас добра абараняе ад выпраменьвання магнітнае поле Зямлі, у космасе гэтага няма, таму патрэбна пакрыццё, якое забяспечвае ахову. Калі б мы запусцілі спадарожнік, а праз год ён выйшаў са строю з-за выпраменьвання, былі б вялікія эканамічныя страты. Усё абсталяванне трэба скампанаваць, абараніць і забяспечыць сумесную работу. Бо гэта вялікая колькасць мікрасхем, электронікі, сістэм сілкавання. Лічу, што мы можам ганарыцца нашымі распрацоўкамі. Быць даследчыкамі касмічнай прасторы — гэта гуляць у вышэйшай лізе, — рэзюмаваў Аляксандр Шумілін.

Алена КРАВЕЦ.

Жывая памяць аб першых вызваліцелях

Знакаміты контрудар на Дняпры ў 1941 годзе сарваў актыўнае наступленне нямецкіх войск на маскоўскім напрамку і даў магчымасць эвакуіраваць прадпрыемствы Гомеля

Сёлета 55 гадоў, як на цэнтральнай плошчы Жлобіна быў адкрыты абеліск «ВОІНАМ-ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ». Гэты памятны знак — чатырохгранны пілон з шэрага граніту. На адным з яго бакоў размешчаны барэльеф ружовага колеру з выявай чырвонаармейцаў і выбітымі надпісамі: «У цяжкі 1941 год, 15 ліпеня, воіны 21-й арміі ўзялі штурмам акупаваны Жлобін», «Подзвігам вашым — слава», «Воінам-вызваліцелям», «1941 год, 15 ліпеня».

Помнік воінам-вызваліцелям 63-га стралковага корпуса 21-й арміі на цэнтральнай плошчы Жлобіна.

ПА МЯСЦІНАХ БАЯВОЙ СЛАВЫ

Абеліск «ВОІНАМ-ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ» — сімвал памяці і ўдзячнасці жыхароў Жлобіншчыны подзвігу савецкіх байцоў 63-га стралковага корпуса пад камандаваннем Леаніда Пятроўскага. Улетку 1941 года яго воіны фарсіравалі Дняпро, нанеслі моцны контрудар фашыстам, прарвалі і ўкліняліся ў абарону праціўніка месцамі на 30 кіламетраў, вызвалілі Рагачоў і Жлобін. Дзякуючы подзвігу савецкіх байцоў больш як на месяц было спынена наступленне ворага на гомельскім напрамку. Гэта дало абласному цэнтру час для эвакуацыі прамысловых аб'ектаў, каштоўных рэсурсаў, гараджан. Ваенная аперацыя, праведзеная байцамі 63-га стралковага корпуса пад камандаваннем Леаніда Пятроўскага, таксама больш як на месяц адцягнула значныя сілы фашысцкіх войскаў ад наступлення на Маскву.

Карпатлівую работу па зборы і захаванні інфармацыі пра ваенную гісторыю вызвалення райцэнтра ў 1941 годзе працягваюць супрацоўнікі Жлобінскага гісторыка-краязнаўчага музея. Асноўныя матэрыялы пра баі 63-га стралковага корпуса сабраны старшым навуковым супрацоўнікам установы Кацярынай Цісецкай у музейным праекце «Жывая памяць» і сумесным з грамадскай арганізацыяй «Патрыёты Беларусі» праекце «Захаваем гісторыю». Дапамогу ў падрыхтоўцы дадзенага тэксту аказала і навуковы супрацоўнік Вікторыя Ільіна.

Нарадзіўся Леанід Пятроўскі ў 1902 годзе на Данбасе. Да рэвалюцыі паспеў адслужыць у імператарскай арміі, пасля адвучыўся ў школе прапаршчыкаў, атрымаў пасаду малодшага афіцэра роты запаснога кулямётнага палка ў Петраградзе, потым — камандзіра роты. У лістападзе 1917-га ўжо ў атрадах Чырвонай гвардыі браў удзел у штурме Зімовага палаца. Удзельнічаў у баях супраць германскіх войскаў на Паўночным фронце і на Усходнім фронце супраць Калчака. У 1920 годзе на савецка-польскай вайне быў цяжка паранены, трапіў у палон, але па абмене вярнуўся на радзіму. Пасля — вучоба ў Ваеннай акадэміі Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі, курсы ўдасканалення вышэйшага кіруючага саставу, прызначаны камандзірам стралковай дывізіі, пазней камандзірам 5-га стралковага корпуса Беларускай ваеннай акругі, камандуючым Сярэднеазіяцкай ваеннай акругай, членам Ваеннага савета і намеснікам камандуючага Маскоўскай ваеннай акругі. У канцы 1938-га — звальненне з арміі. Ён знаходзіўся пад следствам у органах НКУС, аднак не быў арыштаваны, а ў жніўні 1940 года справа ў адносінах Леаніда Пятроўскага была спынена, ён адноўлены ў званні, прызначаны на пасаду камандзіра 63-га стралковага корпуса.

ВЯРТАННЕ НА БЕЛАРУСЬ

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны яго корпус перадыслацыраваны на заходні напрамак. Вядома, што з Беларуссю былі звязаны гады камандзірскай маладосці военачальніка. Тут пачалася гісторыя і яго асабістага шчасця. У 1923 годзе ў Віцебску Леанід Рыгоравіч пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Надзеяй Вікулавай. У 1937 годзе на пасадзе камкора 5-га стралковага корпуса на Беларусі праводзіў вучэнні: наступленне ад Бабруйска на Рагачоў і Жлобін...

Ужо на трэці дзень ад пачатку Вялікай Айчыннай вайны чыгуначны вузел у Жлобіне пераведзены на надзвычайны графік работы: у дэпо зманціраваны бронецягнік і накіраваны ў прыфрантавую зону, тут жа ў дэпо сталі вырабляць санітарныя вагоны-лятучкі. У Жлобіне і Стрэшыне створаны знішчальныя батальёны і атрады самаабароны. Іх задачы — вядзенне разведкі, прадухіленне панікі і дыверсій, захаванне грамадскага парадку, дапамога ў правядзенні эвакуацыі. Жлобінскі знішчальны батальён быў створаны 27 чэрвеня і налічваў звыш 100 чалавек. Фарміраваўся ён з партыйных і савецкіх работнікаў, камсамольцаў, супрацоўнікаў НКУС, актывістаў. Адначасова з добраахвотнікаў і моладзі непрызыўнога ўзросту ствараліся атрады і групы народнага апалчэння. У Жлобіне толькі на чыгуначным вузле атрад народнага апалчэння склаў каля ста чалавек.

27 чэрвеня 1941 года нямецкая авіяцыя ўпершыню бамбіла чыгуначны вузел Жлобіна. З ліпеня 1941 года, заходняя частка раёна і горад былі занятыя нямецкімі войскамі. Чырвонаармейскія фарміраванні 21-й арміі Заходняга фронту занялі абарону на левабярэжжы Дняпра. 6 ліпеня часці 117-й стралковай дывізіі правялі разведку боем і выбілі акупантаў з горада, але пад націскам ворага вымушаныя былі адысці на выходныя рубяжы за Дняпро.

Тым часам Генеральным штабам і Стаўкай Вярхоўнага галоўнакамандавання распрацаваны план арганізацыі абароны і затрымання ворага па лініі рэк Дняпро і Бярэзіна. Камандуючы Заходнім фронтам маршал Савецкага Саюза Сямён Цімашэнка аддаў загад фарміраванням 21-й арміі перайсці ў контрнаступленне ў напрамку Бабруйска і знішчыць нямецкую групоўку, якая прарвалася да Быхава.

У рамках якраз таго контрудару 63-і корпус пад камандаваннем камкора Леаніда Пятроўскага і фарсіраваў Дняпро. Аперацыя стала настолькі нечаканай для немцаў, што першапачаткова яны нават не далі адпор. Толькі калі савецкія часці выйшлі на заходнія ўскраіны горада, немцы арганізавалі ўзмоцненае супраціўленне.

Тым не менш, 13—15 ліпеня воіны Пятроўскага выбілі немцаў са Жлобіна і Рагачова. Яны развілі наступленне на Бабруйск і прабіліся на 30 кіламетраў углыб тэрыторыі, занятай ворагам. Пра гэтую перамогу Саўінфармбюро апавясціла ўсю краіну. Аперацыю падтрымлівалі байцы жлобінскага і рагачоўскага знішчальных батальёнаў, а таксама палкоў народнага апалчэння.

Успаміны відавочцаў тых падзей захоўваюцца ў фондах Жлобінскага гісторыка-краязнаўчага музея.

Малодшы лейтэнант П. А. Лушнікаў, які змагаўся ў шэрагах 465-га гвардзейскага стралковага палка, успамінаў пасля вайны: «...у размяшчэнне дывізіі на грузавой машыне прыбыў камкор таварыш Пятроўскі Л. Р. і аддаў загад збіць з пазіцый не паспеўшыя абкапацца нямецкія часці. Дывізія рынулася ў атаку... Нават цяпер, праз 30 гадоў, цяжка забыць яе. Дывізія знаходзілася ў старым хваёвым бары. Немцы адкрылі шалёны агонь з усіх відаў артылерыі і мінамётаў. У нас на вачах падалі гіганцкія хвоі. Мы перайшлі ў імклівую штыкавую атаку. Вялікую частку немцаў знішчылі на месцы, а астатнія кінуліся назад у раку Дняпро перапраўляцца ў горад Рагачоў».



Апошні ліст генерала Пятроўскага да жонкі.

Захаваліся ўспаміны пра баі за Жлобін і камандзіра батарэі 3-га дывізіёна 63-га стралковага корпуса Леаніда Папкоўскага: «Фарсіравалі Дняпро побач з падарваным чыгуначным мостам. Прыкрываў пераправу бронецягнік, які стаяў паблізу падарванага моста з боку Гомеля. Каля пераправы быў і камандзір корпуса Пятроўскі. Я далажыў становішча, ён тут жа даў распараджэнне палкоўніку, які кіраваў пераправай, прапусціць гарматы за Дняпро і загадаў на тым баку арганізаваць прыкрыццё пераправы, каб даць магчымасць прапусціць за раку больш тэхнікі і войскаў. Што і было зроблена».

Камандзір 318-га гаўбічнага артылерыйскага палка 63-га стралковага корпуса палкоўнік Г. П. Куляшоў у сваіх успамінах згадваў адзін цікавы выпадак: «Наткнуўшыся на лютае супраціўленне нямецкай пяхоты, якая ўмацавалася на вышыні, 154-я стралковая дывізія запаволіла наступленне. Л. Р. Пятроўскі загадаў палкоўніку Фоканаву на досвітку сіламі аднаго стралковага палка атакаваць вышыню і выбіць адтуль ворага. Раніцай камандзір корпуса з'явіўся ў размяшчэнні палка, якому была пастаўлена гэтая баявая задача. Нападзенне затрымлівалася. Камандзір палка растлумачыў прычыну затрымкі тым, што інтэнсіўны агонь праціўніка не дасць нават галаву падняць. Выслухаўшы даклад камандзіра палка, Л. Р. Пятроўскі моўчкі павярнуўся і пайшоў па акопе. Потым ён вылез на бруствер і спакойна пайшоў уздоўж акопа. Камандзіру палка і камбатам прыйшлося ісці за ім. Як і меркаваў Пятроўскі, вораг, як кажуць у такіх выпадках, «палохаў» і вёў не асабліва прыцэльную стральбу. Прайшоўшы па брустверы перад усім батальёнам і спусціўшыся ў акоп, Пятроўскі ціха спытаў камандзіра палка: «Дык вы кажаце, нельга галаву падняць?» Той збянтэжыўся, маўчаў.

Леанід Рыгоравіч спакойна распарадзіўся: «Даю вам на арганізацыю нападзення дзве гадзіны. Праз дзве гадзіны трыццаць хвілін вышыня павінна быць узята». У прызначаны тэрмін полк авалодаў вышынёй».

ЖЛОБІН АДБІТЫ

Батальён 437-га стралковага палка пад камандаваннем капітана Фёдара Баталава першы ўварваўся ў Жлобін. Калі на наступную раніцу вораг спрабаваў акружыць батальён, нашы воіны не толькі не адступілі, а, адбіўшы варожае нападзенне, зноў адкінулі гітлераўцаў. Шэсць разоў узнімаў свой батальён капітан Фёдар Баталаў, двойчы справа дахадзіла да штыкавых удараў, і вораг вымушаны быў адступіць. Батальён адцягнуў на сябе значныя варожыя сілы, каб даць магчымасць прасунуцца па тэрыторыі іншым падраздзяленням дывізіі і поўнасцю вызваліць Жлобін. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за мужнасць і гераічнасць, праяўленыя ў баях за горад Жлобін, камандзіру батальёна капітану Баталаву Фёдару Аляксеевічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

ЛЕГЕНДАРНАЯ ВАЙСКОВАЯ АПЕРАЦЫЯ

Контрудар на Дняпры сыграў вялікую ролю ў пачатковым перыядзе вайны: сарваў актыўнае наступленне ворага на маскоўскім напрамку, прыкметна аслабіў войскі правага крыла групы армій «Цэнтр». А яшчэ контрудар байцоў 63-га стралковага корпуса стаў сведчаннем таго, што нават у цяжкіх умовах пачатку вайны часці Чырвонай Арміі не толькі ўстойліва абаранялiся, але і дастаткова паспяхова вялі наступальную аперацыю.

Два беларускія гарады — Жлобін і Рагачоў — сталі першымі ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны вызваленымі ад фашыстаў. Цэлы месяц на гэтай тэрыторыі зноў дзейнічала савецкая ўлада. Каля тыдня танкавы клін Гудэрыяна, скінуты з берагоў Дняпра, быў прымушаны шукаць новую пераправу. Немцы не толькі адступілі, але і перагрупавалі свае сілы. Корпус пад камандаваннем Пятроўскага сарваў планы нямецкага камандавання. 31 ліпеня прыйшла вестка пра тое, што за ўмелае кіраўніцтва баявымі дзеяннямі камандзіру корпуса Леаніду Рыгоравічу Пятроўскаму прысвоена званне генерал-лейтэнанта.

ТРЫМАЛІ АБАРОНУ

30 дзён і начэй корпус трымаў абарону і перакрываў шляхі наступлення ворага на гомельскім напрамку. Але, нягледзячы на поспехі, Чырвоная Армія адыходзіла. Корпус быў адрэзаны ад асноўных сіл, кальцо вакол яго сціскалася. Позным вечарам 13 жніўня ў штабе прынялі тэрміновую шыфраграму — загад Пятроўскаму «неадкладна ўступіць у камандаванне 21-й арміяй». Неўзабаве прыбыў і самалёт за Пятроўскім. Але Леанід Рыгоравіч не змог у такі цяжкі час пакінуць байцоў свайго корпуса. У камандавання фронтам ён прасіць адтэрмінаваць выкананне загада і на дасланым самалёце адпраўляе ў тыл цяжкапараненага байца. Сам жа пачынае рыхтаваць прарыў акружэння і адначасова наступленне.

На досвітку вораг перайшоў у наступленне, прарваў абарону 154-й стралковай дывізіі, разбурыў пераправы праз Дняпро ў раёне Жлобіна, да якога ўсё падыходзілі і падыходзілі новыя нямецкія часці. Ім была пастаўлена задача акружыць 63-ці стралковы корпус, адкрыць дарогу на Гомель. У самога ж корпуса сувязь перапынілася. Камкору Пятроўскаму прыйшлося кіраваць баявымі дзеяннямі, не маючы ніякіх звестак пра становішча на суседніх участках фронту.

У ноч на 15 жніўня савецкія байцы пачалі адыходзіць на мяжу Столпня, Гарадзец, Жлобін для таго, каб сіламі 154-й стралковай дывізіі нанесці ўдар па ворагу ў бок Стрэшына і адкінуць яго за Дняпро. Манеўр атрымаўся. Імклівы ўдар прымусіў гітлераўцаў адступіць. Усё гэта раздражняла нямецкае кіраўніцтва: такога нахабства яны не чакалі, як і таго, што корпус будзе стаяць насмерць. Супраць яго байцоў, якіх засталіся ўжо нябоўныя дзве дывізіі, вораг кінуў сем адборных пяхотных дывізій. Буйныя сілы праціўніка падцягваліся і з тылу.

Без боепрыпасаў і харчавання, у акружэнні, генерал Пятроўскі пачынае прарыў даручаных яму часцей. Сам камкорпуса з групай байцоў прарываецца да часцей, якія закрывалі адыход дывізій, каб дапамагчы ім адбіцца ад ворага. Пятроўскі зноў напарадзе байцоў, сам вядзе іх у атаку.

16 жніўня ў 12 гадзін ён аддаў загад на прарыў, дзе рукой дапісаў: «Усяму начсаставу, незалежна ад звання і пасады, у перыяд начной атакі, аж да злучэння часцей корпуса з часцямі Чырвонай Арміі знаходзіцца ў перадавых ланцугах, маючы пры сабе эфектыўную зброю з задачай аб'яднаць вакол сябе ўвесь асабовы склад дывізіі...»

У раёне Чацвярні Пятроўскі ўдакладніў задачы. Атака прызначалася на 3 гадзіны 17 жніўня 1941 года.

Брацкая магіла ў вёсцы Старая Рудня, дзе ў 1944 годзе былі перапахаваны астанкі генерала Пятроўскага.

Успыхваюць рукапашныя сутычкі. Гіне ў штыкавой атацы начальнік штаба корпуса А. Фейгін, цяжка паранены начальнік артылерыі А. Казакоў, па-геройску гіне ад'ютант генерала — лейтэнант В. Колесаў, а група на чале з Леанідам Пятроўскім трымаецца. 17 жніўня камкор зноў паранены. Як сцвярджаюць гісторыкі, каб пазбегнуць палону, ужо атрымаўшы раненне, генерал застрэліўся. Адбылося гэта паміж вёскамі Рудзенка і Скепня Пірэвіцкага сельсавета Жлобінскага раёна.

Захаваўся ліст Леаніда Пятроўскага, які ён напісаў у апошнія дні жыцця сваёй жонцы: «Прывітанне і найлепшыя пажаданні. Карыстаючыся выпадкам, пішу гэту пісульку, каб паслаць Вам пару фатаграфій. Адна, па-мойму, нядрэнная. Здымаўся ў лесе, недалёка ад таго месца, дзе мы жывём. У нас сёння «весела». Ноч мы не спалі, ды і цяпер у напружанні. Я здаровы і жывы. Пішыце мне. Нашы таварышы ўжо атрымліваюць ад сваіх лісты, у якіх мяне віншуюць са званнем. Я апрануў ужо генеральскія зорачкі і хаджу як у новай форме. Заканчваю. Прывітанне ўсім. Вас усіх цалую, гэта значыць цябе, Надзя, і Волю. Усім прывітанне. Ваш Леанід. 13.08.41».

У жніўні 1941 года генерала Пятроўскага пахавалі на ўзлеску вёскі Рудзенка. Але ў 1944 годзе астанкі генерала былі перанесены і перапахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Старая Рудня. Там жа цяпер узвышаецца бронзавы бюст генерала Пятроўскага. На самім жа месцы гібелі гэтага гераічнага чалавека ў 1979 годзе быў устаноўлены помнік з надпісам-прысвячэннем: «ТУТ 17.VIII.1941 г. па-геройску загінуў камандзір 63-га стралковага корпуса генерал-лейтэнант Пятроўскі Леанід Рыгоравіч».

Доўгія гады складана было зразумець, што ж здарылася з генералам Пятроўскім і яго акружэннем у трагічныя дні жніўня 1941 года — доступ да дакументаў быў абмежаваны. У 1944 годзе, пасля вызвалення рэспублікі ад фашыстаў і распачатага расследавання, была знойдзена магіла камкора, а на ёй крыж і надпіс на нямецкай мове «Генерал-лейтэнант Пятроўскі». Мясцовыя жыхары распавялі, што савецкага генерала немцы пахавалі з вайсковымі ўшанаваннямі. Дадзены факт сыграў сваю ролю ў ацэнцы дзейнасці 63-га стралковага корпуса і асабіста яго камандзіра. І гэта нягледзячы на тое, што 6 чэрвеня 1944 года была праведзена эксгумацыя цела генерал-лейтэнанта з наступным канставаннем: «...На чэрапе і ў зоне цемянной і левай скроневай косці парушэнні цэласнасці чэрапа зоркападобнай формы, памерам 10 на 18 сантыметраў...». Відавочны факт — Пятроўскі застрэліўся.

Праз гады на абарону сумленнага імя генерала ўстала эліта савецкай арміі, маршалы СССР Дзмітрый Язаў, Андрэй Яроменка. Георгій Жукаў у сваім звароце да кіраўніцтва краіны пісаў: «Леаніда Рыгоравіча Пятроўскага я добра ведаў як аднаго з самых таленавітых і адукаваных военачальнікаў, і калі б не заўчасная гібель, думаю, што ён стаў бы камандзірам буйнога маштабу». Рашэннем Палітбюро ЦК КПСС і ўрада СССР у 1964 годзе генерал-лейтэнант Пятроўскі быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

У 1990 годзе Леаніду Пятроўскаму было прысвоена званне ганаровага грамадзяніна Жлобіна. У райцэнтры працягваюць захоўваць і шанаваць памяць не толькі аб подзвігу генерала, але і аб гераічных байцах 63-га стралковага корпуса.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, матэрыялы і фатаграфіі дадзены Жлобінскім гісторыка-краязнаўчым музеем.

Абеліск на месцы пахавання ў 1941 годзе камкора Леаніда Пятроўскага каля вёскі Рудзенка.

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

ПАЖАР НА КОЛАХ

Што рабіць, калі загарэўся аўтамабіль?

Уладальнікі аўтамабіляў заўсёды з трывогай і смуткам назіраюць за тым, як гарыць чужы аўтамабіль. Аднак ці многія з іх задумваюцца над тым, што такі ж лёс можа напаткаць і ўласнае аўто. І няважна — гэта стары легкавік або новенькая іншамарка. Чаму адбываецца ўзгаранне аўтамабільнага транспарту і што рабіць у выпадку надзвычайнай сітуацыі, разбіраліся з ратавальнікамі.

Асноўная прычына — кароткае замыканне

У канструкцыю сучасных аўто ўваходзіць нямала матэрыялаў, якія вельмі добра гараць. Практычна ўсе элементы салона схільныя да ўзгарання. Нямала дэталяў, гатовых успыхнуць як запалка, і ў маторным адсеку. А ўжо сам факт таго, што большасць аўтамабіляў перамяшчаецца дзякуючы бензіну, сведчыць аб павышанай пажаранебяспечнасці гэтага транспартнага сродку.

Прычын, якія спрыяюць узгаранню, — вялікая колькасць. Гэта як тэхнічныя праблемы, так і неасцярожнае абыходжанне з агнём. Ніхто не выключаў і наўмысныя падпалы. Што датычыцца ўзгарання па тэхнічных прычынах, то, як правіла, яны адбываюцца або з-за няправільнай эксплуатацыі, або з-за ўстаноўкі дадатковага абсталявання. Прычым, як кажуць спецыялісты, магчымасць пажару залежыць не ад года выпуску аўтамабіля, а ад яго стану і абслугоўвання.

Адна з самых распаўсюджаных прычын узгарання — кароткае замыканне. Дрэнныя кантакты, неадпаведнасць сячэння правадніка нагрузцы, павелічэнне нагрузкі звыш пашпартнай — усё гэта наступствы самастойнага рамонту аўто або работы майстраў нелегальных станцый тэхнічнага абслугоўвання. Нярэдка аўтамабілі гараць і з-за механічнага разбурэння вузлоў і дэталяў агрэгатаў.

Самаўзгаранні і наступствы ДТЗ

У перадапошні дзень сакавіка ў цэнтр аператыўнага ўпраўлення Лагойскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях паступіла паведамленне аб узгаранні аўтамабіля ў гарадскім пасёлку Плешчаніцы. Па ўказаным адрасе неадкладна выехалі падраздзяленні МНС. Пасля прыбыцця да месца ўзгарання ратавальнікі ўбачылі, што за метр ад гаража гарэў прыпаркаваны аўтамабіль. Байцы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях аператыўна ліквідавалі ўзгаранне. Прычына яго высвятляецца.

За некалькі дзён да гэтага ратавальнікі тушылі легкавы аўтамабіль у Маладзечне. У выніку пажару ў машыне былі пашкоджаны левае крыло і прыборная панэль. Адна з версій узгарання, якія разглядаліся следчымі, — парушэнне правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання (кароткае замыканне электраправаднікі).

Напрыканцы года ў сталіцы аўто загарэлася падчас руху. Прычынай самаўзгарання сталі тэхнічныя няспраўнасці. Летась, у канцы лістапада, жудасная трагедыя адбылася ў Чавускім раёне. У выніку дарожна-транспартнага здарэння загарэлася іншамарка. Салон аўтамабіля быў заблакіраваны. Кіроўца і дзве яе пасажыркі — тры маладыя дзяўчыны — згарэлі зажыва...

Вогнетушыцель — пад рукой

Як заўважаюць ратавальнікі, сучасны аўтамабіль згарае дашчэнту за пяць-шэсць хвілін. Прычым нярэдка гэта адбываецца на вачах уладальніка. Ад машыны застаецца толькі счарнелы жалезны каркас і рухавік.

Аднак шанц выратаваць аўтамабіль усё ж такі ёсць. Для гэтага неабходна своечасова выявіць узгаранне. Распазнаць яго дапаможа пах бензіну ці гарэлай гумы ў кабіне, павінна насцярожыць і з'яўленне дыму з-пад капота.

Калі загарэўся аўтамабіль, выклікайце МНС па тэлефонах 101 або 112. Ацаніўшы ступень рызыкі, да прыезду ратавальнікаў паспрабуйце патушыць узгаранне самастойна.

— Для таго каб ліквідаваць пажар на пачатковай стадыі, загадзя пакладзіце ў аўтамабіль вогнетушыцель, прыладу для зняцця клемы акумулятара і шчыльныя баваўняныя пальчаткі, — рэкамендуе **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Пры тушэнні разлітага пад машынай паліва скарыстайцеся вогнетушыцелем, падаючы пену або парашок у напрамку ад краю да цэнтра ачага. Пры тушэнні ўзгарання пад капотам паступова і асцярожна адкрыйце яго — пажадана збоку палкай ці манціроўкай, бо пры гэтым магчымы выкід полымя. Накіроўвайце вогнетушыцель на агонь найбольш інтэнсіўнага гарэння ці накрыйце полымя брызентам, закідайце пяском, друзлай зямлёй, снегам, заліце вадой.

Катэгарычна забараняецца прыступаць да тушэння, калі вы ў прамасленай вопратцы або вашы рукі змочаныя бензінам, — гэта вельмі небяспечна! Пры немагчымасці хутка ліквідаваць узгаранне адыдзіце ад машыны на бяспечную адлегласць — можа ўзарвацца паліўны бак. Ні ў якім разе не сядайце ў аўтамабіль, які гарыць, і не спрабуйце яго завесці.

Як адзначае Анастасія Швайбовіч, у радыусе небяспечнай зоны (не менш за 10 метраў) не павінна быць людзей. «Паспрабуйце адкаціць у бок аўтамабілі, якія стаяць побач, каб агонь не перакінуўся на іх, — звяртае ўвагу афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС. — Калі ў кабіне падпаленага аўтамабіля знаходзіцца чалавек, а дзверы заклінавала, то ўзламайце дзверы ці выбіце шкло (манціроўкай, каменем або нагамі). Выцягніце пацярпелага з машыны, выклічце «хуткую».

І яшчэ вельмі важная рэкамендацыя. Каб пазбегнуць такой непрыемнасці, як узгаранне аўтамабіля, сачыце за станам свайго транспартнага сродку і своечасова праходзьце тэхнічны агляд.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 20 %) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

ОАО «СЛОНИМСКАЯ КАМВОЛЬНО-ПРЯДИЛЬНАЯ ФАБРИКА»

Предмет торгов, краткая характеристика	**Лот № 1 – Капитальное строение, инв. № 450/С-20867 – пилорама с пристройкой и подвалом** общей площадью 443,2 кв. м, кирпичное, 1995 г. п. и **технологическое оборудование:** рама лесопильная Р63-4Б в комплекте с оборудованием (инв. № 225); электроталь ТЭ-100 (инв. № 2205); электроталь ТЭ-100 (инв. № 2209), транспортерная линия (инв. № 2206)		
Информация о земельном участке	Кадастровый номером 425450100001010263, площадь 0,4959 га, целевое назначение – для строительства и обслуживания здания пилорамы, право аренды по 04.10.2071 г.		
Место-нахождение	Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, 50, корпус 7		
Начальная цена с учетом НДС	**76 663,86 рублей**	**Задаток (1 %)**	**767,00 рублей**
Условие аукциона	Покупатель оплачивает затраты продавца, связанные с заключением договора поручения на организацию и проведение торгов по продаже имущества в размере 1 % от цены продажи лота		
Сведения о продавце: ОАО «Слонимская камвольно-прядильная фабрика», г. Слоним, ул. Брестская, 50, тел.: 8 (01562) 25037, 25072			
Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел.: 8 (0152) 621632, 621631, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906			
Срок заключения договора купли-продажи: в течение 10 дней с момента проведения аукциона. Условия оплаты: в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи			
Торги состоятся 04 мая 2023 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8			
Срок подачи документов для участия в торгах	Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, 2-й этаж, каб. 6 с 8.30 до 17.30 (понедельник–пятница), обед – с 13.00 до 14.00. **Последний день приема заявлений – 27.04.2023 года до 16.00**		
Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте www.fincentr.by. Тел. для справок: 8 (0152) 621632, 621630			
Предыдущая публикация: газета «Звязда» от 06.10.2022 г., 06.01.2023 г.			

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БПХО» (Продавец)

Аукцион состоится 13.05.2023 в 11.00
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1, состав:

1. Ремонтно-строительный цех, инв. № 110/С-86164, 2307,7 кв. м.
2. Здание склада РСЦ, инв. № 110/С-102697, 200,1 кв. м.
3. Закрытый склад РСЦ, инв. № 110/С-102693, 628,2 кв. м.
4. Автостоянка, инв. № 110/С-102634, 2603 кв. м.
5. Гараж на три автомашины, инв. № 110/С-102636, 187,4 кв. м.
6. Пост охраны № 8, инв. № 110/С-102583, 3,9 кв. м.
7. Благоустройство РСУ, инв. № 110/С-111836, 8818 кв. м.
8. Трубопровод сетевой воды от ТКЗА до РСЦ, инв. № 110/С-111717, 80,4 м.
9. Трубопровод хозпитьевой воды от ВК-22А до РСУ, инв. № 110/С-111758, 179,4 м.
10. Участок канализационной сети от РСУ до КК-116, инв. № 110/С-111721, 187,6 м.
11. Кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ-0,4 кВ ТП-ЦМЛМ до ЩО «Автостоянка», инв. № 050009, 245,6 м.
12. Кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ ЦМЛМ до РУ «РСУ», инв. № 050007, 122,5 м.
13. Кабельная линия 0,4 кВ от НЩ ЦМЛМ до РП «Пилорама», инв. № 050008, 128 м.

Адрес Лота № 1: г. Барановичи, ул. Фабричная, 13В; 13В/1; 13В/2; 17; 13Б/1; 13Б/2; 7, благоустройство РСУ; 7, трубопровод сетевой воды от ТКЗА до РСЦ; 7, трубопровод хозпитьевой воды от ВК-22А до РСУ; 7, участок канализационной сети от РСУ до КК-116; 7, кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ-0,4 кВ ТП-ЦМЛМ до ЩО «Автостоянка»; 7, кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ ЦМЛМ до РУ «РСУ»; 7, кабельная линия 0,4 кВ от НЩ ЦМЛМ до РП «Пилорама».
Начальная цена с НДС 20 % – 801 347,51 руб. Задаток – 100 000,00 руб. Земельный участок 141000000006002693, 1,8890 га, право арены по 22.08.2046. Шаг аукциона – 5 %.
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков – 11.05.2023 в 11.00.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на три года имущества, принадлежащего **ГААСУ «АВИАЦИЯ»** (Продавец)

Аукцион состоится 04.05.2023 в 14.00
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1: Право заключения договора аренды части здания учебного корпуса с инв. № 600/С-88879.

Площадь, сдаваемая в аренду: 215,8 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Липковская, 12/25. Начальная цена с НДС – 1094,11 руб.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и Организатора аукциона **ino.by.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельного участка в частную собственность

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

Лот № 1. Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (фундамент – сваи железобетонные, железобетон, площадь застройки – 90 кв. м, процент готовности – 14 %) и земельный участок с кадастровым № 225882004601000138 площадью 0,1497 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Шумилинский р-н, Светлосельский с/с, д. Лесковичи, ул. Новая, 20. Ограничения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Круглик, оз. Лесковичи).
Начальная цена предмета аукциона (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом / зем. участок): **2848,91** (1830,95/1017,96) бел. руб. **Задаток:** 284,89 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 64,27 %

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 15.05.2023 в 15.00 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 13.04.2023 до 13.00 13.05.2023. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с** BY28 AKBB 3604 3310 7500 6200 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК АКВВBY2X, УНП 300988882, код операции 40901. Получатель платежа: Светлосельский сельский исполнительный комитет. **Условия для победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона**: в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением документации, необходимой для проведения аукциона; обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в Шумилинское бюро РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта; разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить строительство объекта в сроки, установленные законодательством Республики Беларусь. **Назначение земельного участка** в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией

Повторный аукцион проводится в порядке, установленном Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ), которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и представлением участниками аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией (тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63), а также возможность осмотра на местности предмета аукциона. Конт. тел. (29) 2488898.

Первичная профсоюзная организация филиала «Завод электромонтажных изделий» открытого акционерного общества «Белэлектромонтаж» прекращает деятельность в связи с ликвидацией филиала «Завод электромонтажных изделий» открытого акционерного общества «Белэлектромонтаж».

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220073, г. Минск, ул. Бирюзова, д. 10.

УНП 100799172

Идентификационную пластиковую карточку ООО «Группа компаний Мариэлт» № АВ 0022195 агента по операциям с недвижимостью Синяк Юлии Леонидовны **считать недействительной в связи с утерей**.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
12 красавіка 2023 г. № 13 (699)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ГЭТА ПАВІННА БЫЦЬ У СЭРЦАХ ЖЫВЫХ

Фота БелТА.

У ЧОРА, у Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў, члены Прэзідыума і работнікі сакратарыята Савета Рэспублікі ўсклалі кветкі ў мемарыяльным комплексе «Масюкоўшчына».

Мемарыяльны комплекс «Масюкоўшчына» — месца, знакавае не толькі для сталіцы і не толькі для Беларусі. Тут у часы Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся адзін з найбуйнейшых на акупаванай тэрыторыі былога Савецкага Саюза канцэнтрацыйны лагер смерці Шталаг-352. У гэтым лагеры фашысты прымянялі асабліва жорсткую сістэму катаванняў і зневажанняў чалавечай годнасці. Людзі ўтрымліваліся ў нечалавечых умовах, у адрынах, бараках, стайнях. Ваеннапалонным, якія масава прыбывалі, не хапала месца, і многіх з іх, асабліва восенню і зімой у 1941–1942 гадах, кідалі ў лагеры проста пад адкрытым небам, дзе амаль адразу ж яны гінулі ад холаду, голаду і хвароб. З ліпеня 1941-га да 3 ліпеня 1944 года ў Шталагу-352 загінула больш за 80 тысяч салдат і афіцэраў Савецкай арміі, якія трапілі ў палон, і мірных жыхароў, сагнаных у лагер з Мінска і навакольных вёсак. Акрамя грамадзян былога СССР, са снежня 1943 года да чэрвеня 1944-га ў канцлагеры знаходзіліся італьянскія салдаты і афіцэры, якія змагаліся супраць фашыстаў на баку Савецкага Саюза.

«Савет Рэспублікі шэфствуе над мемарыяльным комплексам «Масюкоўшчына». Штогод члены Савета Рэспублікі, работнікі сакратарыята ўскладаюць кветкі ў памяць аб ахвярах, якія спачываюць тут, у гэтай зямлі. Больш за 80 тысяч чалавек — савецкіх ваеннапалонных і цывільных — знайшлі тут свой апошні супакой, — сказаў **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ.** — Сённяшні дзень — сімвал нязломленасці, сілы духу. Гэты дзень прымеркаваны да даты паўстання ў Бухенвальдзе. Нягледзячы на ўсе жахі і жорсткасць, знясіленыя, змардаваныя людзі знайшлі ў сабе сілы зрынуць кіраўніцтва лагера, узяць яго пад кантроль і дачакацца вызвалення. У выніку многія жыцці былі выратаваны. Мы памятаем і больш ранніе падзеі, калі вязні канцлагера Сабібор паднялі паўстанне і шматлікія з іх змаглі вызваліцца. Потым доўгі час ваявалі і неслі праўду аб «райскім садзе», якім працягваюць называць асобныя еўрапейскія палітыкі тое месца, дзе яны жывуць, лічачы іншых «джунглямі», з якімі яны змагаліся, знішчалі нашых продкаў як непатрэбную расліннасць».

Віцэ-спікер падкрэсліў, што мы не павінны забывацца аб гэтых трагічных старонках нашай гісторыі. «Гэта павінна захавацца ў сэрцах жывых, каб яны памяталі і не дапусцілі таго зла, якое прыйшло на нашу зямлю. Тры мільёны чалавек загінулі на тэрыторыі Беларусі ў падобных месцах. Мы ведаем, што сёння ў практыцы, ідэалогіі асобных еўрапейскіх краін сталі дапушчальныя факельныя шэсці з выкарыстаннем нацысцкай сімволікі, арыентаваныя на перавагу народа, этнасу, навучанне ў школах і гэтак далей. Калі хтосьці забыўся, да чаго гэта можа прывесці, прыйдзіце ў Беларусь і паглядзіце, — дадаў ён. — Гэта трэба не мёртвым, гэта трэба жывым. Вельмі важна захаваць памяць, гісторыю, каб больш такога не дапусціць».

Паводле БелТА.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Дыялог пакаленняў

Таццяна РУНЕЦ сустрэлася з найбольш актыўнымі школьнікамі Маскоўскага раёна сталіцы і ўручыла ім членскія білеты БРСМ

Сустрэча са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, а таксама ўрачыстая цырымонія ўручэння маладзёжных білетаў адбылася ў верхняй палаце парламента. Маладыя людзі атрымалі магчымасць не проста пабываць у будынку дзяржаўнага органа, дзе прымаюцца адны з найважнейшых рашэнняў у краіне, але і пазнаёміцца з гісторыяй Савета Рэспублікі.

Найлепшыя ўражанні ў маладых людзей засталіся і ад сустрэчы са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах. Сам фармат дыялогу, які прапанавала Таццяна Рунец, прыйшоўся моладзі даспадобы. Член Прэзідыума верхняй палаты парламента максімальна даступна і зразумела расказала моладзі пра структуру Савета Рэспублікі, задачы, якія вырашае дзяржаўны орган, над якімі законапраектамі сенатары працуюць у цяперашні час.

Адказала парламентарый і на пытанні школьнікаў. У прыватнасці, іх цікавіла, як стаць удзельнікам патрыятычнага праекта «Цягнік Памяці». Таксама маладыя людзі хацелі даведацца пра сучасныя формы патрыятычнага выхавання насельніцтва, заканадаўчую дзейнасць парламентарыяў. Шчырай Таццяна Рунец была і падчас адказу на пытанні асабістага характару. Сенатар згадала, пры якіх абставінах у свой час ёй уручалі камсамольскі білет, расказала, кім марыла стаць у дзяцінстве, падзялілася падзеяй, якая стала найбольш запамінальнай. Ведаючы, што старшыня Пастаяннай камісіі любіць чытаць, школьнікі пацікавіліся, ці ёсць у Таццяны Рунец любімая кніга, і папрасілі парады, дзе можна адпачыць у Беларусі.

У сваю чаргу, сенатар задавала сустрэчныя пытанні, адзначала, на што важна звярнуць увагу сучаснай моладзі. Галоўнае, па яе словах, каб маладыя людзі любілі сваю краіну і прыслухоўваліся да бацькоў, якія жадаюць ім толькі найлепшага.

Як адзначыла Таццяна Рунец у размове з карэспандэнтам «Звязды», ва ўзаемадзеянні з моладдзю патрэбна апрабаваць усе фарматы. «Увогуле, з маладымі людзьмі трэба размаўляць, — лічыць Таццяна Рунец. — Прычым на роўных, на адной мове. Часам нават і парады папрасіць. Без павучанняў. З павучаннямі моладзь не заўсёды ўспрымае інфармацыю».

Паводле яе слоў, сустрэчы з моладдзю вельмі важныя. «Хоць бы для таго, каб сувязь пакаленняў не была страчана, — акцэнтавала ўвагу сенатар. — Як кажа наш Прэзідэнт, моладзь — гэта звяно, якое звязвае. Ім будаваць нашу краіну, заўтра гэтыя маладыя людзі прыйдуць на кіруючыя пасады. Па меншай меры, такія сустрэчы закладваюць пэўны падмурак, у тым ліку сямейных традыцыйных каштоўнасцяў. Ва ўсім свеце навязваюць нетрадыцыйныя каштоўнасці, а мы павінны расказаць, што з'яўляецца асновай сям'і, асновай нашага грамадства. Я заўсёды кажу нашай моладзі, што трэба любіць людзей і не быць абыякавымі. Калі мы будзем абыякавымі, мы нічога не пабудуем».

Таццяна Рунец падкрэсліла, што ў нашай краіне рабоце з моладдзю ўдзяляецца вельмі вялікая ўвага. «Узяць хоць бы 18 ваенна-патрыятычных клубаў, створаных на базе воінскіх часцей, — удакладніла парламентарый. — Думаю, што гэта яшчэ не мяжа і падобныя клубы будуць стварацца далей».

Сенатар засталася задаволеная сустрэчай з актывам БРСМ Маскоўскага раёна. «Спрабавала простай мовай расказаць моладзі аб тым, чым займаюцца члены Савета Рэспублікі, — заўважыла Таццяна Рунец. — У сілу свайго ўзросту яны яшчэ не ўсё могуць зразумець. Аднак, у любым выпадку, гэтая сустрэча ім запомніцца. Па-першае, таму што адбылася яна ў Савеце Рэспублікі. Па-другое, што ў гэтай дзяржаўнай установе ім уручылі членскі білет БРСМ. Спадзяюся, што карыснай для іх была і наша размова. Дыялог пакаленняў — гэта таксама свайго роду падмурак, які мы закладваем для далейшага развіцця нашай дзяржавы».

Вераніка КАНЮТА.

ГУМАНІТАРНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА, ВАЛАНЦЁРСТВА І ТУРЫЗМ

Чым беларусы здзівяць удзельнікаў X Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў гэтых сферах

Пляцоўка, дзе можна абмеркаваць найбольш актуальныя для Беларусі і Расіі пытанні і дзе выпрацоўваюцца механізмы па рэалізацыі дамоўленасцяў, прынятых на найвышэйшым узроўні. А яшчэ — неад'емная частка сістэмы расійска-беларускага стратэгічнага партнёрства.
Так называюць і такім бачаць Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі не толькі яго ўдзельнікі, але і старшыні верхніх палат парламентаў абедзвюх краін Наталля Качанава і Валянціна Матвіенка, якія высока ацэньваюць такія сустрэчы і іх патэнцыял па садзейнічанні прамым кантактам паміж рэгіёнамі, бізнесменамі і арганізацыямі краін. Сёлета ў межах юбілейнага X Форуму, які пройдзе ў сталіцы Башкартастана Уфе 26—28 чэрвеня, адбудуцца пасяджэнні дзесяці секцый, праграма якіх да круглай даты, як і самога форуму, абяцае быць вельмі насычанай. У прыватнасці, беларуская дыяспара плануе стварыць цэлую вёску ў межах гастранамічнага турызму, а валанцёры — прэзентаваць дапаможнік па арганізацыі і падрыхтоўцы валанцёраў — інструктараў роўнага навучання «Валанцёрскі навігатар», які надрукуюць у маі. Што яшчэ рыхтуе беларускі бок да форуму, «Звязда» даведалася на рабочых сустрэчах Ірыны СТАРАВОЙТАВАЙ, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці са спецыялістамі адпаведных ведамстваў.

Агульнае навучанне і інжынерныя школы ў адукацыі

Мяркуецца, што ўдзел у рабоце секцыі «Гуманітарнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. Вынікі дзесяцігоддзя і перспектывы развіцця» возьмуць да 120 чалавек. Гэта прадстаўнікі Мінадукацыі, Мінкультa, НАН Беларусі, навукова-даследчых інстытутаў, маладыя парламентарыі, сенатары і студэнты Башкартастана. І, пэўна, правільна абмяркоўваць культуру, адукацыю і навуку разам, бо яны трыадзіныя, адзначыла Ірына Старавойтава.

На секцыі плануецца дзесяць выступоўцаў з боку Беларусі. З дакладам пра перспектывы супрацоўніцтва ў галіне адукацыі паміж ВНУ і навуковымі арганізацыямі Беларусі і Расіі, а таксама падрыхтоўкі кадраў для інавацыйнай эканомікі Саюзнай дзяржавы на секцыі плануе выступіць **Аляксандр БАХАНОВІЧ, першы намеснік міністра адукацыі:**

— Другім выступоўцам на секцыі прапануецца рэктар Беларуска-расійскага ўніверсітэта (Магілёў) Міхаіл Лусцянкоў, які раскажа аб праблемах і перспектывах міждзяржаўнага ўзаемадзеяння ў навукова-тэхнічнай сферы і адукацыі. А рэктар БНТУ Сяргей Харытончык агучыць інфармацыю пра адукацыйную навукова-вытворчую каапэрацыю БНТУ і ўстаноў вышэйшай адукацыі Расіі. Не застанецца па-за ўвагай і тэма інжынерных школ (ВНУ тэхналагічнага профілю), якім удзяляюць вялікую ўвагу прэзідэнты абедзвюх краін.

БНТУ сумесна з Пскоўскім дзяржаўным універсітэтам (Расія) атрымалі сродкі па праекце «Прыярытэты — 2030», які рэалізуюе ўрад Расіі. Гэтая тэма можа стаць цікавай і іншым беларускім ВНУ, якія маглі б азнаёміцца з вынікамі такой работы і з часам далучыцца да гэтага праекта, падтрымала ідэю Ірына Старавойтава:

— На базе нашага Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі 270 чалавек — спецыялістаў з Расійскай Федэрацыі, дарэчы, атрымліваюць адукацыю. Яны прыязджаюць да нас, каб вучыцца прафесійнай адукацыі. У Расіі ствараюцца сумесныя прадпрыемствы, і патрэбна падрыхтоўка спецыялістаў пад іх.

Сумесныя праекты ў навуцы

Прадстаўнікі НАН Беларусі бяруць актыўны ўдзел у форуме, прычым не толькі ў секцыі, звязанай з навукай, але і ў секцыях аграрнай тэматыкі, ІТ-тэматыкі і прамысловай палітыкі, заўважыў **Васіль ГУРСКІ, галоўны навуковы сакратар НАН Беларусі,** які плануе выступіць на секцыі з дакладам аб навуковым супрацоўніцтве:

— Ёсць пра што расказаць, бо мы актыўна супрацоўнічаем з Расійскай акадэміяй навук: з Курчатаўскім інстытутам і рэгіянальнымі інстытутамі. Выконваем мы і агульную саюзную праграму. З улікам агульнай накіраванасці нашых краін на аднаўленне гістарычнай праўды другім выступоўцам варта стаць дырэктару нашага інстытута гісторыі Вадзіму Лакізу. Шмат у нас сумесных праектаў па выданні кніг, архіўных даследаваннях.

Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай уласнасці падрыхтавана да падпісання на форуме пагадненне з расійскім бокам аб супрацоўніцтве ў сферы лічбавізацыі, удакладніў **Аляксей КУРМАН, першы намеснік гендырэктара цэнтра.**

— Мы супрацоўнічаем у межах Саюзнай дзяржавы, створана камісія па інтэлектуальнай уласнасці і іншыя пляцоўкі. З дапамогай інтэлектуальнай уласнасці мы пераадольваем санкцыйныя бар'еры і сучасныя выклікі.

Тандэмы і дыяспары ў культуры

Міністр культуры Анатоль Маркевіч на секцыі агучыць дасягненні ў гэтай сферы і напрамкі, над якімі будуць працаваць, у прыватнасці над імпартазамяшчэннем і нацыянальнай бяспекай у сферы культуры, расказала **Ірына КАРПОВІЧ, начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры:**

— Другі дакладчык — дырэктар Цэнтра нацыянальных культур Вольга Якабсон раскажа пра айчынную дыяспару, якая з'яўляецца непасрэдным правадніком беларускай культуры і ідэалогіі ў Расіі. Расіяне таксама прыцягваюць нашу дыяспару да сумесных мерапрыемстваў, і яе прадстаўнікі вучаць іх, што такое Дажынкі, Купалле. Трэцім дакладам стане тэма канцэртных і тэатральна-відовішчных мерапрыемстваў. Нашы тэатр і канцэртныя арганізацыі зарабляюць грошы падчас гастроляў, праводзяць адукацыйны працэс у межах майстар-класаў, навучання спецыялістаў, робяць тандэмы, накшталт расійскі дырыжор — наш аркестр, наш аркестр — расійскі балет.

Рыхтуецца да падпісання падчас форуму ў сферы культуры каля 25 дагавораў, у прыватнасці, Нацыянальны гістарычны музей Беларусі і Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць — герой» гатовыя да дагавораў з Нацыянальным музеем Башкартастана.

Анлайн-падключэнні і анімацыйныя ролікі валанцёраў

Асобнай на форуме стане секцыя «Валанцёрскі рух як фактар умацавання расійска-беларускага супрацоўніцтва. Новыя магчымасці для сацыяльных ініцыятыў», у якой возьмуць удзел 70 чалавек, у тым ліку па сем выступоўцаў з кожнага боку. Мяркуецца, што ў рамках секцыі будзе падпісана пагадненне паміж Рэспубліканскім валанцёрскім цэнтрам (Беларусь) і Рэспубліканскім цэнтрам валанцёрскага руху і падтрымкі маладзёжных ініцыятыў (Башкартастан, Расія). У секцыі будуць удзельнічаць яшчэ 100 чалавек з валанцёрскіх цэнтраў устаноў вышэйшай адукацыі, падзялілася Ірына Старавойтава:

— У Беларусі 76 тысяч валанцёраў, якія займаюцца сур'ёзнай сацыяльна-арыентаванай дзейнасцю: дапамогай састарэлым, людзям, якія апынуліся ў цяжкай сітуацыі, медыцынскай і харчовай дапамогай у часы кавіду. Валанцёры таксама актыўна працуюць на спартыўных мерапрыемствах.

Аляксандр КАДЛУБАЙ, намеснік міністра адукацыі, зазначыў:

— У межах секцыі плануецца асвятліць выніковасць і эфектыўнасць валанцёрскіх праектаў, неабходнасць падрыхтоўкі добраахвотнікаў да ўзаемадзеяння з рознымі катэгорыямі насельніцтва (ад разавых заняткаў да школы валанцёраў, майстэрні інклюзіўнага ўзаемадзеяння і дысцыпліны на выбар «Арганізацыя валанцёрскай дзейнасці»). Удзел у форуме таксама стане інструментам матываваці добравольцаў-валанцёраў і дапаможа ім абмяняцца вопытам.

Запланаваны таксама анлайн-падключэнні васьмі валанцёрскіх цэнтраў устаноў ВНУ з усёй Беларусі і інтэрактыўныя пляцоўкі з майстар-класамі па інклюзіўнай анімацыі.

«Сярэбраныя» валанцёры

Пра дзяржаўную палітыку па актыўным даўгалецці ў Беларусі, нацыянальную стратэгію ў гэтым кірунку і цікавы напрамак — «сярэбранае валанцёрства» на секцыі раскажа міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч, падзялілася інфармацыяй **Марына АРЦЁМЕНКА, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

— Другім дакладчыкам стане сам валанцёр «сярэбранага» ўзросту — Ларыса Аленская, старшыня савета грамадзян сталага ўзросту пры Віцебскім гарвыканкаме. Яна раскажа аб практыках, якія сёння рэалізоўваюцца і вельмі запатрабаваны людзьмі 65+. У атрадах «сярэбраных» валанцёраў ужо дзве тысячы чалавек.

У рамках секцыі запланаваны таксама анлайн-падключэнні валанцёраў з ВНУ, да якіх сенатар прапанавала далучыць і добраахвотнікаў сталага ўзросту, каб сабраць іх разам, прадэманстраваўшы такім чынам салідарнасць і адзінства.

У 2025-м у рамках праграмы Саюзнай дзяржавы, дарэчы, плануецца зладзіць саюзны злёт грамадзян старэйшага пакалення «Мы за актыўнае даўгалецце», і на форуме мяркуецца адпрацаваць акалічнасці яго арганізацыі.

Вопыт работы валанцёраў у сітуацыях міграцыйных крызісаў, школа падрыхтоўкі і рэагавання валанцёраў на надзвычайныя сітуацыі, школа маладзёжнага лідара (навучанне асновам догляду дома і першай дапамогі) — гэтыя і іншыя кірункі дзейнасці валанцёраў у рамках Чырвонага Крыжа таксама закрануць на форуме. Сярод магчымых для абмеркавання на секцыі тэм бачыцца і стварэнне сумеснай праграмы па валанцёрскім менеджменце, і правядзенне даследаванняў, каб высветліць, чаму людзі ўвогуле ідуць у валанцёры.

Абавязковая «зоркавасць» і новыя турыстычныя маршруты

Расійска-беларускае супрацоўніцтва па развіцці новых турыстычных кірункаў стане галоўнай тэмай секцыі, прысвечанай турызму. Удзел у ёй ад Беларусі возьмуць, акрамя прадстаўнікоў Мінспорту і Міністэрства аховы здароўя спецыялісты Віцебскага і Брэсцкага аблвыканкамаў, арганізацыі «МагілёўАблТурыст» і іншыя. Мяркуецца, што ў рамках секцыі будуць узняты пытанні, звязаныя з міграцыйнай палітыкай і візавым рэжымам.

Супрацоўніцтва на ўзроўні нацыянальных праектаў і ўніфікацыя заканадаўства стануць прадметам абмеркавання на секцыі, заўважыў **Алег АНДРЭЙЧЫК, намеснік міністра спорту і турызму:**

— У Расіі існуе абавязковая класіфікацыя і сертыфікацыя гасцініц, іншымі словамі, кожная такая ўстанова павінна мець нуль зорак, адну-дзве і г. д. У нас жа гэта справа добраахвотная. У пералік па сертыфікацыі варта было б унесці адпаведны абавязак. Пра інавацыйныя падыходы ў развіцці турызму і перспектывы трансгранічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй раскажуць прадстаўнікі Віцебскай вобласці. А дырэктар «МагілёўАблТурыста» Алена Карпенка раскажа пра стварэнне маршруту Пскоў — Віцебск — Магілёў — Гомель — Бранск — Смаленск.

Плануецца падпісанне пагадненняў паміж Мінспорту і Міністэрствам эканамічнага развіцця Расіі. Віцебскі аблвыканкам мяркуе падпісаць пагадненне на ўзроўні ўпраўлення спорту і турызму з турагентам «Галерэя краін» (г. Уфа) і нацыянальнай тураператарскай арганізацыяй Уфы. «МагілёўАблТурыст» плануе пагадненне з кампаніямі «Ін.Турыст-Астрахань».

Цікавым бачыцца і арганізацыя авіямаршруту Брэст — Мінеральныя Воды паміж Брэсцкай і Растоўскай абласцямі. А на форуме мяркуецца зладзіць выстаўку пра турыстычны патэнцыял Беларусі на прыкладзе Віцебшчыны.

— Мы ўжо адпрацавалі праект «Новы погляд на Полацк», а на форуме прадставім прэзентацыю праекта «Новы погляд на Оршу». Па трансгранічных маршрутах са Смаленскам адпрацавалі індывідуальныя туры «Смаленск — Віцебск культурны». Гэткі ж праект мяркуем адпрацаваць з Псковам, — падзялілася **Святлана АСТАНІНА, загадчык сектара турызму і фізкультурна-аздараўленчай работы ўпраўлення спорту і турызму Віцебскага аблвыканкама.** — А ў рамках Мінпрыроды ўжо рэалізуюецца праект *«Пскоў — Верхнядзвінск» (на прыкладзе заказніка «Асвейскі»).*

Па выніку рабочых нарад адносна арганізацыі дзейнасці секцый на форуме будуць складзены рэзалюцыі, дзе акрэсляць прыярытэтныя кірункі работы, што базіруюцца на вопыце работы форумаў папярэдніх гадоў, рэзюмавалі іх удзельнікі.

Ірына СІДАРОК,
фота аўтара.

АДНА БАЗАВАЯ СУПРАЦЬ БУЛЬДОЗЕРА

У сельскай мясцовасці намецілася тэндэнцыя да павелічэння колькасці продажаў пустых дамоў

ЦЯПЕР фактычна ў кожным населеным пункце ёсць пустыя дамы, а таксама былыя адміністрацыйныя, гаспадарчыя пабудовы, якія не выкарыстоўваюцца. Іх упарадкаванне — адзін з істотных складнікаў работы мясцовай улады. Сельскія, пасялковыя, раённыя, гарадскія Саветы дэпутатаў працуюць над вырашэннем такой складанай задачы. У кожным раёне ёсць праграмы работы, згодна з якімі штогод зносяцца нічыйныя пабудовы, некаторыя ж прадаюцца. Варта сказаць, што апошнім часам вырашэнню акрэсленых пытанняў спрыяюць змяненні ў заканадаўстве.

Прыклады дамоў з Адзінага рэестра.

З павышэннем цаны ў 423 разы

Менавіта Указ № 330 «Аб распараджэнні маёмасцю», які ўступіў у сілу ў мінулым месяцы, дапамог зрушыць з месца да гэтага безвыніковую справу продажу старадаўняй панскай сядзібы ў Агарэвічах Ганцавіцкага раёна. Падрабязна пра маёнтак і пошук гаспадароў для яго расказвалася ў нашай газеце за 31 сакавіка. Было некалькі спроб прадаць даволі добры дом плошчай 324 квадратныя метры, але ахвотных не знаходзілася. А калі аб'явілі аб магчымым продажы за адну базавую велічыню згодна з указам, пакупнікоў ужо стала дзесяць. У выніку першапачатковая цана вырасла ажно ў 423 разы, лот пайшоў з аўкцыёну за 15,5 тысячы рублёў. Сядзібу купіў мінчанін. Галоўнае, цяпер ёсць чалавек, які ўзяў на сябе адказнасць за захаванне гісторыка-культурнай каштоўнасці. Ёсць усе падставы спадзявацца, што сядзіба не знікне, не будзе больш гібець.

Пра паспяховыя таргі з выгадай для мясцовай улады нядаўна расказвалі аўтару гэтых радкоў у Дзмітравіцкім сельскім Савеце Камянецкага раёна. Цэламу шэрагу населеных пунктаў сельсавета спрыяе блізкая пушча. Менавіта Белавежская пушча прываблівае нябедных пакупнікоў. Людзі з грашыма ахвотна набываюць дамы, а таксама ўчасткі. Ім нават лепей браць не старую хаціну, а пусты ўчастак, каб ставіць на ім новы дом. Таму для сельвыканкама выглядае лепшым знесці старыя, трухлявыя дамы альбо іх рэшткі, расчысціць участак і выставіць яго на таргі. Так робяць у вёсцы Макавішчы, дзе ўжо вырасла цэлая вуліца сучасных дамоў катэджнага тыпу і аграсядзіб. Пачыналі з 12 тысяч рублёў за ўчастак, але, як той казаў, стаўкі растуць. Літаральна нядаўна (25 сакавіка) участак у вёсцы Абрамава пайшоў з малатка за 40 тысяч рублёў. На гэтым месцы таксама раней быў нечы дом, цяпер, трэба думаць, узвядуць новы.

Па 116-м Указе

Але прыведзеныя прыклады — хутчэй, выключэнне, чым правіла. У большасці сваёй мясцовая ўлада працуе з пустымі дамамі, якія рады былі б аддаць і за адну базавую. Напрыклад, у склад Тэвельскага сельскага Савета Кобрынскага раёна ўваходзіць 21 населены пункт. **Старшыня сельвыканкама Іна КУЗНЯЦОВА** расказала, што летась на тэрыторыі сельсавета знеслі дзевяць дамоў, зямлю ўвялі ў севазварот. На гэты год планы яшчэ большыя. Шэраг вёсак сельсавета можна аднесці да катэгорыі так званых паміраючых, дзе засталіся пражываць адзін-два-тры чалавекі. Асабліва хутка згасае жыццё ў той частцы сельсавета, што мяжуе ажно з трыма раёнамі: Пружанскім, Жабінкаўскім, Камянецкім. Населеныя пункты тут дажываюць свой век.

Кіраўнік мясцовай улады лічыць, што працаваць у дадзеным кірунку пасля ўступлення ў сілу 27 верасня 2021 года Указа № 116 «Аб адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленні работы з пустымі дамамі» стала прасцей, чым раней, але ж праблем і цяжкасцяў пакуль хапае. І звязаныя яны найперш са стаўленнем спадчыннікаў да сваёй нерухомасці. Здараецца, што яны нічога не робяць на бацькоўскай сядзібе, але і расстацца з ёй не спяшаюцца. Як вядома, прызнаць дом безгаспадарным па-ранейшаму можа толькі суд.

На першым этапе сельвыканкам збірае звесткі пра хату, якая стаіць больш за тры гады без выкарыстання, агляд праводзіць спецыяльна скліканая камісія. Далей у работу ўключаюцца адпаведныя службы райвыканкама. Вядзецца пошук патэнцыяльных спадчыннікаў. Іх інфармуюць аб магчымым прызнанні пабудовы безгаспадарнай. На дадзеным этапе яны могуць заявіць правы і, што важна, узяць на сябе абавязацельствы па прывядзенні ў парадак сядзібы ды пабудоў. Калі ахвотных узяцца за работу ў вызначаны тэрмін не знаходзіцца, дакументы накіроўваюцца ў суд, які прымае рашэнне.

— Даводзілася зносіць зусім нехлямяжыя дамы, але, шчыра кажучы, мне заўсёды крышку шкада, — працягвае Іна Валер'еўна. — Тыя, якія можна выкарыстоўваць, імкнёмся прадаваць. Некалькі гадоў таму прадалі нядрэнную хату ў Завершшы. Цяпер і паглядзець прыемна. Новыя гаспадары ачысцілі двор ад хмызняку, паставілі новую агароджу. Пастаянна яны не жывуць, але паспяхова выкарыстоўваюць дом у якасці дачы.

Сёлета Тэвельскі сельскі Савет выставіў на продаж чатыры хаты, якія раней былі перададзены ва ўласнасць як нічыйныя. Пасля ацэнкі Брэсцкім агенцтвам па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры быў вызначаны рыначны кошт кожнай з пабудоў, аб'явы аб продажы размешчаны на сайце райвыканкама, у раённай газеце. Варта заўважыць, што з 1 студзеня звесткі яшчэ размяшчаюцца ў Адзіным рэестры пустых дамоў.

І ахвотныя знаходзяцца. Працэдура такая: грамадзяне падаюць заявы, якія затым будуць разгледжаны на пасяджэнні выканкама з прыняццем адпаведнага рашэння. Пасля таго ў кожным выпадку заключаецца дагавор аб куплі-продажы, выстаўляюцца рахункі з улікам затрат па ацэнцы (гэта прыкладна 400 рублёў). Пасля аплаты пакупнік зможа распачаць афармленне дакументаў на ўласнасць адносна дома і ўчастка. Так што адна базавая — гэта толькі першы этап у куплі дома, яго афармленне абыходзіцца даражэй. Варта тое ўлічваць.

Іван ДАЎЖУК, старшыня Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў, гаворыць, што вопыт работы Тэвельскага сельвыканкама яны вывучалі на дэпутацкай камісіі:

— Пакуль у Тэўлях з усіх нашых сельсаветаў працуюць найбольш эфектыўна ў згаданым кірунку. І ў раённым Савеце, і ў органах выканаўчай улады пануе меркаванне, што трэба менш зносіць і больш прадаваць пустыя пабудовы. Па-першае, гэта выгадна, бо знесці дом, прывесці ў парадак участак сёння абыходзіцца ў добрую капейчыну, а па-другое, па-чалавечы выглядае больш правільным знайсці дому гаспадара. Тут вялікія спадзяванні звязваем з новым дакументам — Адзіным рэестрам маёмасці. Любы чалавек можа зайсці на гэты электронны рэсурс і знайсці нешта прымальнае для сябе. Можа, у каго настальгічныя пачуцці ўзнікнуць, і захоча былы зямляк, скажам, жывучы на Віцебшчыне або Магілёўшчыне, прыдбаць хату на радзіме бацькоў ці дзядоў, а потым і пераехаць альбо пражываць сезонна.

Новыя рабочыя месцы і новыя гаспадары

Не толькі пустыя дамы парадкуе ў населеных пунктах мясцовая ўлада. Некалькі гадоў таму ў адным з сельсаветаў яго кіраўнік паказваў аўтару гэтых радкоў пляцоўку, на якой раней стаяла школа 1905 года пабудовы. Старшыня бадзёра паведаміў, што будынак знеслі, пляц разраўнавалі. Мне стала вельмі шкада гістарычнага будынка: уяўленне адразу стала маляваць карцінку магчымага музея ці іншага карыснага аб'екта ў сценах былой навучальнай установы. Хоць цалкам верагодна, што і сцены там дрэнна захаваліся...

А вось у сакавіку камітэт «Брэстаблмаёмасць» правёў даволі ўдалыя таргі — цэлы шэраг вясковых пустых аб'ектаў набыў новых гаспадароў. У Целяханах Івацэвіцкага раёна прадалі былую ветэрынарную лячэбніцу. Будынак плошчай 175 квадратных метраў таксама з гісторыяй: узведзены ў 1936 годзе; мае прыбудову са склепам, пайшоў за 8,9 тысячы рублёў. Целяханы — даволі вялікі пасёлак, вядомы не толькі лыжнай фабрыкай. Тут паспяхова працуюць як асобныя прадпрыемствы, так і вытворчыя ўчасткі іншых. У пасёлку пражывае больш за 4200 чалавек.

Аксана МЯЛІК, старшыня Целяханскага сельскага Савета, расказала, што ветлячэбніцу купіў прадпрымальнік з Івацэвіч:

— Гэта наш зямляк, ён родам з суседняй вёскі. Тут мае намер адкрыць цэх па вытворчасці вырабаў з мармуровай пліткі. Думаю, два-тры новыя рабочыя месцы неўзабаве будуць створаны. Яшчэ рыхтуецца да продажу будынак лазні ў Краглевічах, а патэнцыяльнага пакупніка мы ўжо знайшлі — гэта мясцовы фермер, ён мае план выкарыстання будынка ў сваёй гаспадарцы. Ёсць яшчэ адзін праблемны будынак у згаданым пераліку — былы сельскі клуб у адной з малых вёсак. Яго ўжо прадалі, а потым новы ўласнік з'ехаў за межы Беларусі. Цяпер вырашаецца далейшы лёс пабудовы ў адпаведнасці з законам. Больш нежылых пустых аб'ектаў няма. Калі такія з'яўляюцца, стараемся хутка іх уладкоўваць.

Цяпер актыўна працуем з пустымі дамамі. Іх у васьмі населеных пунктах сельсавета 19. Пяць з іх прайшлі падрыхтоўчыя працэдуры і судом перададзеныя сельскаму Савету. Дзве хаты рыхтуем да продажу, а тры будзем зносіць, бо яны не выглядаюць перспектыўнымі, — сказала старшыня сельвыканкама.

Старшыня Івацэвіцкага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр САРОКА паведаміў, што вопыт работы Целяханскага сельскага Савета быў станоўча ацэнены на пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі, якое прайшло 15 сакавіка:

— Там адзначалі, што ў рабоце органа мясцовай улады ёсць сістэма, адсюль і вынікі. У іншых сельсаветах таксама праводзіцца работа па ўпарадкаванні нічыйных дамоў. Скажам, цяпер у раёне 619 безгаспадарных дамоў. Яшчэ некалькі гадоў таму гэтая лічба набліжалася да 1500. Значыць, праведзена немалая работа. І яшчэ некалькі лічбаў: калі ў 2021 годзе было прададзена 8 дамоў, а знесена 94, то ў 2022 годзе прадалі ўжо 41, а знеслі толькі 64 дамы. Праглядаецца выразная тэндэнцыя да таго, каб хаты займелі новых гаспадароў.

Мы прааналізавалі, дзе найлепш прадаюцца старыя хаты, і ўбачылі, што цікавасць пакупнікоў выклікаюць маляўнічыя мясціны, каля азёр і рэк: Бабровічы, Соміна, Гошча, — працягвае Аляксандр Фёдаравіч. — Цікавяцца маёмасцю і ў прыгарадзе з тым разлікам, каб можна было дабірацца ў райцэнтр на работу. Купляюць дамы людзі сталага веку, якія пакідаюць гарадскія кватэры дзецям. Апошніх цікавіць велічыня ўчастка, каб мець добры агарод. І ў нас цяпер ёсць прапановы на любы густ і любы кашалёк, калі мець на ўвазе продаж за адну базавую велічыню. А на дапамогу ўсім патэнцыяльным пакупнікам — Адзіны рэестр пустых дамоў.

Выбірай і купляй

Згаданы рэестр знаходзіцца на сайце Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь. Варта зайсці на сайт, зарэгістравацца, паглядзець інструкцыю — і можна вывучаць прапановы па ўсёй краіне. Доступ да рэестра адкрыты і бясплатны.

Скажам, цяпер можна знайсці прапановы па сямі дамах у Івацэвіцкім раёне, якія прадаюцца за адну базавую велічыню. Там ёсць кароткае апісанне пабудовы: год узвядзення, плошча, ступень зносу, велічыня зямельнага ўчастка. Ёсць і фотаздымкі выстаўленых на продаж дамоў.

Таксама некалькі дамоў на продаж прапануюць у Маларыцкім, Ляхавіцкім раёнах за адну базавую; у Брэсцкім, Камянецкім, Пінскім раёнах хаты можна купіць з аўкцыёну са стартавай цаной у 37 рублёў. Інфармацыя абнаўляецца, зацікаўленыя могуць рэгулярна наведваць сайт.

У кожным раёне звесткі пра дамы на продаж размяшчаюць таксама на сайце райвыканкама. Там жа маецца інфармацыя пра нежылыя будынкі, былыя вытворчыя, адміністрацыйныя, сацыяльныя аб'екты, якія пры гаспадарскім падыходзе можна пусціць у справу. Звесткі пра аўкцыёны па такіх аб'ектах перыядычна змяшчаюць на сваіх сайтах камітэты дзяржаўнай маёмасці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

КАБ НЕ СОРАМНА БЫЛО ПЕРАД ЗЕМЛЯКАМІ

У Лапаціцкім сельсавеце справы на грамадскія і асабістыя не дзеляць

СЁЛЕТНЯЯ вясна развяла шмат вільгаці. Акрамя таго, што рэкі разліліся, дык вада яшчэ і на агародах стаіць, і на дарогах, і на могілках. У Рабавічах чакаюць, калі нарэшце падсохне, каб талакой пачаць наводзіць усюды парадак.

— Вёска наогул унікальная, людзі самі бяруць ініцыятыву ў свае рукі, — характарызуе населены пункт **старшыня Лапаціцкага сельсавета Сяргей АНТОШКІН.** — Самі грошы сабралі, набылі лесу, мясцовы піларамшчык Анатоль Касцючэнка бясплатна яго распілаваў, купілі фарбу і чакаюць сігналу, каб прыступіць да работ на могілках.

Староста Надзея Голасава лічыць, што ёй пашчасціла з аднавяскоўцамі. Людзі ў асноўным дружныя, добразычлівыя, работы не баяцца, дапамагаюць нават тыя, хто з'ехаў з вёскі ў іншы населены пункт, але не забывае пра малую радзіму. Тая ж Жанна Рыжанкова заўсёды гатовая дапамагчы ў грамадскіх справах. Радуе, што не яна адна. І ўзаемаразуменне з мясцовай уладай ёсць. Старшыня сельсавета заўсёды падтрымае. Праўда, ёсць пытанні, якія на ўзроўні сельсавета не вырашаюцца. Прыходзіцца звяртацца на раённы, а то і абласны ўзровень.

Кожны імкнецца зрабіць сваю вёску ўтульнай для жыцця. Надзея Голасава перажывае, што іх цэнтральную вуліцу псуюць старыя пакручастыя вербы. Іх бы спілаваць пад корань, але ёсць складанасці. Усё вырашаецца паступова. Для ўсяго ёсць свой час. Цяпер вось на першым месцы — могілкі. Да Радаўніцы засталося пару тыдняў, трэба, каб не соромна было перад памерлымі сваякамі і землякамі.

Усяго на тэрыторыі Лапаціцкага сельсавета — 16 могілак. Паўгода таму сельсавет перадаў іх на баланс камунальнікаў, на ім засталіся толькі функцыі па ўліку памерлых.

— На кожны аб'ект ёсць асобны журнал з апісаннем пахаванняў і схемамі іх размяшчэння, — удакладняе суразмоўнік. — Каб было прасцей даглядаць, за могілкамі замацаваныя тыя ці іншыя прадпрыемствы або ўстановы. За намі, напрыклад, могілкі ў Чыкаўцы і Азарычах. У той жа Чыкаўцы жывуць толькі два чалавекі, але прыбраць могілкі сваёй радні прыязджаюць людзі з іншых вёсак сельсавета.

Старшыню сельсавета, дарэчы, застала за разгрузкай дошак. Дапамагалі яму мясцовыя жыхары — Дзмітрый Шынкевіч і Алег Камынін, карані якіх якраз у Чыкаўцы.

— Чавускі лясгас аказаў нам спонсарскую дапамогу — 27 кубоў лесу даў, — тлумачыць Сяргей Антошкін. — Глядзіце, якія роўненькія дошкі — адна пад адну. У нас шмат пенсіянераў, у якіх не хапае грошай паставіць агароджу за свой кошт. Будзем дапамагаць.

А на могілках з агароджамі больш-менш добра, там толькі парадак трэба навесці.

Добраахвотнікаў хапае, бяром сякеры, рыдлёўкі і ідзём, каб нешта падправіць, падраўнаваць, прыбраць.

Суразмоўнік прызнаецца, што людзі ніколі не адмаўляюцца дапамагчы. Галоўнае — спачатку прааналізаваць, што канкрэтна трэба зрабіць. Добра, калі могілкі невялікія, там прасцей навесці парадак. А вось у тых жа Хварасцянах трэба павазіцца. Там упалі 22 дрэвы. Брыгада з камунгаса, староста вёскі, дэпутаты, мясцовыя жыхары згуртаваліся і наводзяць парадак.

— Агароджа на хварасцянскіх могілках новенькая, трэба толькі з дрэвамі разабрацца, — кажа старшыня. — Летась гомельская фірма дапамагла нам выразаць на могілках аварыйныя дрэвы. Мы ім іх аддалі, а яны не сталі браць грошы за свае паслугі. Вось так супольна і вырашаем складаныя пытанні.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

Слаўгарадскі раён.

«НАШЫ ДЗЕЦІ ЖЫВУЦЬ У СЕМ'ЯХ»

Дэпутаты Гомельшчыны спасцігалі вопыт навучання і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі развіцця

ЯК сумесная работа органаў мясцовага кіравання і самакіравання і ўстаноў адукацыі, сацслужбы дапамагае палепшыць якасць жыцця людзей з інваліднасцю — на прыкладзе праектаў, што ажыццяўляюцца ў Рагачоўскім раёне, сацыяльна значную тэму прааналізавалі дэпутаты базавага ўзроўню Гомельшчыны.

Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зенкевіч і кіраўнікі раённых Саветаў дэпутатаў рэгіёна ўзялі ўдзел у традыцыйным навучальным семінары.

Дэпутаты пазнаёміліся з вопытам навучання і выхавання дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, які ўкараняюць супрацоўнікі Рагачоўскага раённага Цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі. У школьных і дашкольных групах тут займаюцца дзеці да 18 гадоў. Ёсць тыя, хто навучаецца дома.

— Акрамя таго, цэнтр вядзе раннюю комплексную дапамогу для больш як ста дзяцей ад нараджэння да трох гадоў. Усяго дзейнасцю цэнтра ахоплена 186 непаўналетніх, — распавяла **дырэктар Рагачоўскага раённага Цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Ірына ХАДЗЬКО.**

Ірына Раманаўна звярнула ўвагу, што дзеці, якія наведваюць заняткі ў цэнтры, прывучаюцца да канкрэтнай практычнай дзейнасці, авалодваюць сацыяльна значнымі ўменнямі і навыкамі.

— Вучым таму, што ім спатрэбіцца ў жыцці: дапамагаць па гаспадарцы, быць самастойнымі ў бытавых справах, сацыялізавацца ў грамадстве, — дадае дырэктар установы.

Спецыялісты Рагачоўскага раённага Цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі са сваімі выхаванцамі абавязкова наведваюць сацыяльна значныя аб'екты горада: вучацца карыстацца паслугамі пошты, аб'ектаў бытавых паслуг. Выходзяць на прагулкі ў паркі, наведваюць разнастайныя мерапрыемствы ў горадзе. Усё гэта дазваляе дзецям з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця вучыцца паводзіць сябе ў грамадскіх месцах, а таксама назіраць і запамінаць інфармацыю навокал, умець звярнуцца да іншых людзей, правільна сфармуляваць свой зварот да іх, калі будзе патрэбна дапамога.

— У нас сёння няма адмоў ад дзяцей-інвалідаў. Нашы дзеці жывуць у сем'ях, яны любімыя, рады вучыцца, займацца, мець зносіны. Такі вынік удалося дасягнуць толькі дзякуючы агульнай рабоце з бацькамі, — падкрэслівае Ірына Хадзько. — Даём дамашняе заданне, просім разам замацоўваць навыкі і ўменні, карысныя для сацыялізацыі ў грамадстве. У нас з бацькамі добра наладжаная зваротная сувязь: дасылаюць і фота- і відэасправаздачы або ў выснай форме дзеляцца тым, што ўдалося замацаваць з дзіцем дома.

Педагогі і выхаванцы Рагачоўскага раённага Цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі запрасілі дэпутатаў паназіраць, як праходзяць іх заняткі па навучанні гатаванню. Дзеці — а іх падтрымалі ў дадзенай справе і дэпутаты — рабілі ўпрыгажэнні для велікодных кулічоў, аздабляліпернікі.

— Сёння мы ў раёне адзначаем, што значная колькасць дзяцей, якія прыходзяць да нас па дапамогу ў маўленчай карэкцыі ці за іншай карэкцыйнай дапамогай у навучанні, вельмі добра развіваюцца. Наладжана работа цэнтра па ранняй комплекснай дапамозе. Варта адзначыць, што сёння пераважная колькасць дзяцей, з якімі займаліся нашы спецыялісты, не набывае крытычных формаў інваліднасці, у параўнанні з часам, калі такой сістэмнай работы яшчэ не вялося, — адзначае дырэктар раённага Цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі.

Маштабная і сістэмная работа вядзецца цэнтрам і з установамі адукацыі ў раёне. Так, на тэрыторыі Рагачоўшчыны працуюць 32 пункты карэкцыйна-педагагічнай дапамогі і 91 клас інтэграванага навучання.

Дзеці з інтэлектуальнай недастатковасцю вучацца як у класах інтэграванага навучання і выхавання, так і ў школе-інтэрнаце, якая размяшчаецца ў аграгарадку Гарадзец на тэрыторыі раёна, паступаюць ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Як правіла, гэта навучанне ў ільготных групах прафтэхадукацыі, дзе юнакі і дзяўчаты вучацца працаваць, набываюць рабочую прафесію. Дзеці са зніжэннем зроку, слыху, функцый апорна-рухальнага апарату паступаюць і ў сярэднія спецыяльныя ўстановы, а нехта і ў ВНУ, тлумачаць спецыялісты адукацыі ў раёне.

Дэпутаты базавага ўзроўню Гомельшчыны ацанілі практыку навучання моладзі з абмежаванымі магчымасцямі рабочым спецыяльнасцям на базе Рагачоўскага дзяржаўнага будаўніча-тэхналагічнага каледжа. Сёння ва ўстанове — 18 навучэнцаў, адукацыйная праграма для якіх складзена з улікам асаблівасцяў іх здароўя. Увогуле ў каледжы набор навучэнцаў з абмежаванымі магчымасцямі пачалі яшчэ ў 2002 годзе. Пасля вучобы яны атрымліваюць спецыяльнасці тынкоўшчыка і цесляра. За гэты час каля 300 выпускнікоў такіх набораў працаўладкавана ў сельскагаспадарчыя і будаўнічыя арганізацыі. Дэпутаты ўбачылі, як вядзецца работа з такой катэгорыяй навучэнцаў і як арганізаваны іх вольны ад заняткаў час.

На пленарным пасяджэнні старшыні райсаветаў рэгіёна абмеркавалі дзейнасць органаў кіравання і самакіравання па падтрымцы, сацыялізацыі і працоўнай інтэграцыі асоб з абмежаванымі магчымасцямі.

Як адзначыла **старшыня Рагачоўскага раённага Савета дэпутатаў Валянціна ГАНКОВІЧ,** у раёне наладжана цеснае ўзаемадзеянне органаў улады і ўсіх адказных службаў і ведамстваў. Гэта дапамагае людзям з абмежаванымі магчымасцямі адчуваць клопат дзяржавы, быць раўнапраўнымі членамі грамадства. На мясцовых прадпрыемствах сёння працаўладкаваны 427 людзей з інваліднасцю. У цэлым жа на Рагачоўшчыне сёння пражывае звыш 3750 людзей з інваліднасцю. Для іх таксама ствараецца даступнае асяроддзе.

— Адзін з пастулатаў Прэзідэнта ў Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу — сацыяльная справядлівасць. Калі мы гаворым пра справядлівасць, то ў жыццё грамадства павінны быць інтэграваны ўсе пласты насельніцтва незалежна ад псіхафізічных ці фізічных магчымасцяў, — падкрэсліла **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ.** Кіраўнік дэпутацкага корпуса рэгіёна падзялілася, што на прыкладзе ў тым ліку Рагачоўскага раёна відаць, наколькі важна пачынаць такую работу з самага нараджэння дзіцяці, якому неабходная дапамога.

«Спачатку гэта дапамога ўстаноў аховы здароўя, пасля — установ адукацыі, каб даць магчымасць дзецям падрыхтавацца ўжо да працоўнай дзейнасці. Бо сёння кожны чалавек хоча і павінен атрымаць работу, быць паўнавартасным членам грамадства», — адзначыла старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by **(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 11.432. **Нумар падпісаны ў 19.30 11 красавіка 2023 года.**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу филиал «Центральный рынок»

Аукцион состоится 28.04.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Лот № 1	
Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-7508 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 956,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129622 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – тепловая сеть), протяженностью 24,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, тепловая сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129623 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 57,6 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129625 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 190,3 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129624 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 159,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129627 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 26,8 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55; - сеть энергоснабжения; - оборудование: вагончик строительный, комплект регулирования температуры, набор мебели, насос «Грундфос» УРС24*40, охранно-пожарная сигнализация, павильон из металлоконструкций, регулятор распределения тепловой энергии, регулятор расхода теплоэнергии МИР 9701, система видеонаблюдения, система пожарной сигнализации; теплосчетчик ТЭМ-104 Ду-15; торговое оборудование (стеллаж, стол для торговли); торговый павильон (5 шт.); торговый павильон 3,2 м (2 торговых места 1,6*1,6); кондиционер настенный (2 шт.); лифт грузовой; пожарная сигнализация; холодильная камера GOLD; холодильная камера склад. Лот 1 имеет обременения со стороны третьих лиц в виде аренды с собственниками павильонов и мест для торговли; прохождение по территории рынка теплотрассы к зданию ООО «Фирма Мока», на которой расположены павильоны и роллеты, в том числе находящиеся в собственности арендаторов
Начальная цена продажи	2 812 126,80 руб. (два миллиона восемьсот двенадцать тысяч сто двадцать шесть рублей восемьдесят копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	281 212 руб. (двести восемьдесят одна тысяча двести двенадцать рублей)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 26 апреля 2023 г. до 15.00**
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 28.12.2022 г.	
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsionykopiya	

Открытое акционерное общество «БАРАНОВИЧСКАЯ ПТИЦЕФАБРИКА» извещает о проведении повторного аукциона по продаже недвижимого имущества

Аукцион состоится 27 апреля 2023 года в 10.00 по адресу: Брестская область, Барановичский район, п/о Русино, здание клуба ОАО «Барановичская птицефабрика»

Предмет торгов Лот:	1. Капитальное строение (детский сад – начальная школа) с инвентарным номером 110/С-95169, общей площадью 316,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский район, Тешевлянский с/с, д. Люшнево, ул. Встречная, д. 131, на земельном участке с кадастровым номером 120489402101000099, площадью 0,5526 га. 2. Капитальное строение (водопроводные сети) с инвентарным номером 110/С-103203, протяженностью 63,6 м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский район, Тешевлянский с/с, д. Люшнево, ул. Встречная, д. 131. 3. Капитальное строение (канализационные сети) с инвентарным номером 110/С-103195, общей площадью 47,8 м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский район, Тешевлянский с/с, д. Люшнево, ул. Встречная, д. 131, протяженностью 47,8 м

Начальная цена без учета НДС руб.	361,70	Размер задатка, руб.	36,17

Продавец и организатор аукциона: ОАО «Барановичская птицефабрика», 225350, п/о Русино, Барановичский район, Брестская область.
Задаток перечисляется с даты публикации данного извещения по 26 апреля 2023 года на расчетный счет Продавца BY73BAPB30124401000 10000000 ОАО «Белагропромбанк» ул. Советская, 150, БИК BAPBBY2X, ОКПО 00745326, УНП 200177723. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе.
Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Условия оплаты: единовременный платеж в течение 10 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи.
Информация о возмещении затрат: участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для их проведения

Договор купли-продажи объекта аукциона заключается не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Дополнительная информация по телефонам: 8 0163 644 694 (юр. сектор), 644 768 (приемная).
Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с документацией по адресу: 225350, Барановичский район, п/о Русино, ОАО «Барановичская птицефабрика»

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 225350, Брестская область, Барановичский район, п/о Русино, ОАО «Барановичская птицефабрика» с пометкой «На аукцион» с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00 по рабочим дням по 26 апреля 2023 года включительно.
Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, размещен на официальном сайте Продавца www.zlatko.by и в извещении о ранее проведенном аукционе, опубликованном в газете «Рэспубліка» 18 декабря 2021 г.

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк»

Наименование объекта продажи	**Изолированное помещение № 2 (назначение – административное помещение) общей площадью 2047,6 кв. м, состоящее из площадей 1–3 этажей 3-этажного административно-хозяйственного здания**
Месторасположение объекта	г. Минск, ул. Киселева, 14
Начальная цена продажи (с учетом НДС)	3 635 520,00 рублей (три миллиона шестьсот тридцать пять тысяч пятьсот двадцать рублей 00 копеек)
Сумма задатка	3 635,00 рублей (три тысячи шестьсот тридцать пять рублей 00 копеек)
Обязательные условия аукциона	Победителю торгов либо единственному участку, изъявившему готовность приобрести реализуемое недвижимое имущество, заключить с ОАО «АСБ Беларусбанк» договор по приобретению имущества (основные средства согласно приложению 1) общей стоимостью 3 341,82 рубля (три тысячи триста сорок один рубль 82 копейки) с учетом НДС, предназначенного для эксплуатации отчуждаемого объекта недвижимости
Открытый аукцион состоится	27.04.2023 в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, актовый зал (6-й этаж)
Заявления и документы на участие принимаются	В рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 26.04.2023 включительно, по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, кабинет 602 (тел.: (017) 279 46 55, (017) 279 49 30)
Продавец	ОАО «АСБ Беларусбанк»
Контактные данные	По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи, обращаться по телефону: (017) 279 46 55 – Сосновский Дмитрий Викторович, (017) 279 47 74 – Баёк Павел Александрович

Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 03.04.2023 включительно на счет № BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.

ООО «Фикс Прайс Запад»

УВЕДОМЛЯЕТ О ВЫЯВЛЕНИИ НЕДОБРОКАЧЕСТВЕННОЙ ПРОДУКЦИИ:

- **желе фруктовое FRUCTOTEKA**, в потребительской полимерной упаковке массой нетто 300 г, дата изготовления 14.11.2022, сроком годности до 14.05.2024, шк 8938532509628, изготовитель: АО «HEADWAY VIETNAM» – несоответствие по содержанию красителей: азорубин Е122, тартразин Е102;
- **игрушки для детей старше 3 лет – краски акварельные с товарным знаком «Луч»**, хохлатый пингвин, 24 увета, без кисти, арт. 29С 1692-08, дата изготовления 08.2022, срок годности не ограничен, шк 4601185014415, изготовитель ПК «Химический завод «Луч» (РФ) – несоответствие по показателю «уровень миграции формальдегида в водной среде»;
- **водолазка детская с маркировкой «INSOLITO»**, арт. Б30307, р-р 28 (рост 110), цвет: в полоску синего, серого, черного, белого цвета, дата изготовления 08.2022, срок годности не ограничен, изготовитель: ООО «AVILON KOKAND» (Узбекистан) – несоответствие по показателю «гигроскопичность»;
- **чай черный байховый индийский «Гита»** в пакетиках для разовой заварки, масса нетто 60 г, шк 4605246003110, дата изготовления 11.2022, срок годности до 10.2025, изготовитель ООО «ОРИМИ» (РФ) – несоответствие по микробиологическому показателю «плесени».

Продукция была снята с реализации и изъята из обращения во всех торговых объектах ООО «Фикс Прайс Запад».

Для недопущения поступления в обращение вышеуказанной продукции ООО «Фикс Прайс Запад» заблокировало ее к поставкам в Республику Беларусь, а также уведомило поставщиков о выявлении недоброкачественной продукции. Аналогичной продукции, принадлежащей ООО «Фикс Прайс Запад», на складах РУП «Белтаможсервис» нет.

УНП 193351144

БАНК РЕШЕНИЕ

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС 31 марта 2023 г.

Наименование банка: ЗАО «Банк «Решение»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	31.03.2023	01.01.2023
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	37 819	27 898
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	20 103	18 440
5	Средства в банках	1104	45 918	68 048
6	Ценные бумаги	1105	29 847	20 295
7	Кредиты клиентам	1106	118 395	110 937
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	454	460
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	20 271	20 234
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	-	-
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	1 357	1 357
13	Отложенные налоговые активы	1112	266	266
14	Прочие активы	1113	4 248	2 915
15	ИТОГО активы	11	278 678	270 850
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	17 974	8 123
19	Средства клиентов	1203	183 851	190 838
20	Ценные бумаги банка	1204	12 005	11 067
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	4 848	4 597
24	ВСЕГО обязательства	120	218 678	214 625
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	35 988	35 988
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	6 428	2 613
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	11 838	11 614
30	Накопленная прибыль	1215	5 746	6 010
31	ВСЕГО собственный капитал	121	60 000	56 225
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	278 678	270 850

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ 31 марта 2023 г.

Наименование банка: ЗАО «Банк «Решение»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	31.03.2023	31.03.2022
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	4 883	4 782
2	Процентные расходы	2012	2 044	2 739
3	Чистые процентные доходы	201	2 839	2 043
4	Комиссионные доходы	2021	8 200	2 330
5	Комиссионные расходы	2022	3 903	983
6	Чистые комиссионные доходы	202	4 297	1 347
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(22)	(191)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	4 102	2 763
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	(761)
11	Чистые отчисления в резервы	207	3 157	1 106
12	Прочие доходы	208	644	556
13	Операционные расходы	209	4 097	3 824
14	Прочие расходы	210	37	86
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	4 569	741
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	1 020	65
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	3 549	676

Председатель Правления С.Д. Будников

Зам. главного бухгалтера Е.Н. Левшевич

Дата подписания: 05 апреля 2023 г.

ЗАО «Банк «Решение», УНП 100789114. Лиц. № 14 от 08.06.2016 НБ РБ

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

АЎТЫЗМ — НЕ ПРЫСУД

Аўтызм вывучаецца ва ўсім свеце ўжо не адно дзесяцігоддзе, але да гэтага часу так ніхто і не прыйшоў да адназначнай высновы аб яго прычынах. Адсутнасць пэўнасці спараджае мноства здагадак і міфаў.

Расстройства аўтыстычнага спектра (РАС) — не хвароба, ім нельга заразіцца і вылечыцца ад яго, аднак усе людзі з РАС могуць вучыцца і развівацца, а пры правільнай падтрымцы нават жыць паўнавартасным жыццём. Ці ёсць сувязь паміж прышчэпкамі і аўтызмам? Як распазнаць і дыягнаставаць расстройства аўтыстычнага спектра, як жыць і сацыялізавацца дзецям з РАС і іх бацькам? Як разабрацца ў гэтым і многім іншым, а таксама якіх поспехаў могуць дасягаць такія дзеці пры правільным падыходзе, расказалі спецыялісты і бацькі дзяцей з РАС.

МІФ 1. Гэта хвароба, якую можна вылечыць

— Аўтызм — не хвароба, а асаблівасць развіцця дзіцяці, якая захоўваецца ў дарослым узросце. І тое лячэнне, якое ў нас выкарыстоўваецца для лячэння іншых псіхічных захворванняў, не пазбаўляе ад сімптомаў і праяў такога стану. Ён застаецца з чалавекам як падчас яго дзяцінства, так і ў дарослым жыцці, — тлумачыць **галоўны ўрач Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя-наркалогія», урач-псіхіятр-нарколаг Аляксей АЛЯКСАНДРАЎ.**

МІФ 2. Гэта парушэнне моўных паводзін

— Аўтызм — не парушэнне моўных паводзін. Многія думаюць, што аўтызм — штосьці пра маўленне, і калі такое дзіця навучыць гаварыць, аўтызм знікне. Моўны кампанент самы прыкметны, бо мы ўзаемадзейнічаем праз мову. Але трэба разумець, што пры аўтызме цярпіць не толькі моўная сістэма ўзаемадзеяння з навакольнымі, але і іншыя, невербальныя спосабы кантактавання. І не толькі яны, але і паводзіны адносна свету і сябе. Гэтае расстройства развіцця ахоплівае ўсе сферы. Але для большасці моўныя парушэнні здаюцца самымі важнымі. Калі такое дзіця пачне размаўляць, расстройства ўсё роўна захаваецца, — кажа Аляксей Аляксандраў.

МІФ 3. Узнікае пасля прышчэпкі

— Гэта не хвароба і ёй, адпаведна, нельга захварэць ад прышчэпкі. Таму варта прышчапляцца па ўсім календары. Прышчэпка — гэта тое, што робіць прыкметным асаблівасці развіцця. Як і тое, калі вы памянялі месца жыхарства, паліклініку, урача. Гэта не развіццё хваробы пасля нейкай падзеі, а тое, з чым дзіця прыйшло ў гэты свет, — звяртае ўвагу ўрач.

Дыягназ мусіць быць пастаўлены да двух гадоў

Аляксей Аляксандраў падкрэслівае, што колькасць дзяцей з аўтызмам павялічваецца. Прыкладна дзесяць гадоў таму ва ўсёй краіне іх было столькі, колькі сёння ў адной толькі Мінскай вобласці — каля 700. Сёння ў рэгіёне 714 дзяцей і 23 дарослых жыве з дыягназам «аўтызм».

— Дыягназ «аўтызм» мусіць быць устаноўлены не да трох, не да пяці, а да двух гадоў, усе гэтаму навучаныя, — адзначае Аляксей Аляксандраў. — І з гэтага ўзросту пачынаецца ранняя дапамога. Створана цэлая сістэма цэнтраў раняга ўмяшання. Гэта не псіхіятрыя, не дамы-інтэрнаты, а першае звяно, куды ходзяць бацькі з маленькімі дзецьмі, — дзіцячыя паліклінікі і бальніцы. Але тут аднаго лагапеда ці дэфектолага мала, у цэнтрах раняга ўмяшання гэта педыятры і дзіцячыя неўролагі, пры неабходнасці — псіхолаг.

Прычым для ранняй дыягностыкі спецыяльнай псіхіятрычнай адукацыі медыку мець не трэба. Сёння распрацаваны першасны скрынінгавы тэст, якому навучаны медыцынскія работнікі. Дыягназ мусіць з'явіцца да дзіцячага садка.

— Лячэння ад аўтызму няма, бо гэта не хвароба. Але да аказання медыцынскай дапамогі адносіцца медыцынская рэабілітацыя. Дастаткова шмат дзяцей, якія маюць дыягназ, маюць і інваліднасць, тады іх рэабілітацыя ажыццяўляецца праз праграмы па інваліднасці. Калі інваліднасць не ўстаноўлена, то праз урача, які лечыць, — псіхіятра, педыятра, неўролага ў паліклініках і дзіцячых бальніцах, — кажа ўрач.

Не ўсе маюць інваліднасць

— Не ўсе дзеці з расстройствам аўтыстычнага спектра маюць інваліднасць, — адзначае **галоўны ўрач медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі Мінскай вобласці Эвеліна СЛІПЧАНКА.** — Інваліднасць вызначаецца ступенню страты здароўя: ад больш лёгкай да цяжкай. Як правіла, на МРЭК для вызначэння ступені інваліднасці накіроўваюцца дзеці з выразнымі псіхалагічнымі парушэннямі, парушанай сацыяльнай адаптацыяй і інтэлектуальнымі парушэннямі.

Бацькі стараюцца абмежаваць такіх дзяцей ад непатрэбных кантактаў з дарослымі, стварыць камфортныя ўмовы, бо наведванне любой установы для іх — пэўны стрэс. Таму арганізаваны выезд камісіі дадому.

— Выяўленне такіх пацыентаў вырасла ў разы. Пяць гадоў таму дзеці з РАС у агульнай колькасці дзяцей з інваліднасцю складалі каля 6 %, цяпер іх лік вырас да 18,5 %, — прыводзіць лічбы Эвеліна Сліпчанка.

Цяпер інваліднасць такім дзецям устанаўліваецца, як правіла, у 4—5 гадоў, а яшчэ пяць гадоў таму — у 10—12 гадоў.

— Гэта сведчыць пра тое, што ў нас правільны напрамак руху, своечасовае і ранняе накіраванне такіх дзяцей на медыка-сацыяльную экспертызу. Для бацькоў гэта своечасовае выдзяленне льгот, гарантаваных дзяржавай, у тым ліку матэрыяльнай падтрымкі, ранняя рэабілітацыя, — кажа суразмоўніца.

На якія пенсіі і дапамогі можна разлічваць?

Толькі ў Мінскай вобласці жыве 6800 дзетак з інваліднасцю (каля 7 %). Каля дзвюх тысяч з іх — дзеці з асаблівасцямі псіхічнага развіцця, у тым ліку 700 дзяцей з РАС, прыводзіць лічбы **намеснік старшыні Мінскай абласной арганізацыі «Беларускі саюз жанчын», намеснік старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама Наталля ІГНАТОВІЧ.**

— Сям'я звяртаецца ў сацыяльныя службы ў пачатку свайго шляху, калі атрымана інваліднасць і ўзнікае права на сацыяльныя гарантыі, ад пенсіі для дзіцяці да розных відаў дапамог. Прамая матэрыяльная падтрымка сем'яў з дзецьмі-інвалідамі, выплаты дапамог, у тым ліку дапамогі па доглядзе дзіцяці з інваліднасцю да трох гадоў, прызначаюцца ў павышаным памеры, — кажа спецыяліст. — Гэта 779 рублёў. На дзяцей, старэйшых за тры гады, выплачваецца дапамога ў памеры 70 % бюджэту пражыткавага мінімуму (БПМ) — 239 рублёў, на іншых дзяцей у сям'і — 170 рублёў (50 % БПМ).

Таксама бацькі або іншыя асобы, якія даглядаюць дзіця-інваліда, атрымліваюць дапамогу па доглядзе дзіцяці, памер якой вызначаецца ў залежнасці ад узросту і ступені страты здароўя. На дзіця да трох гадоў яна складае 341 рубель (1 БПМ). На дзіця, старэйшае за тры гады, — у залежнасці ад ступені страты здароўя. З 1-2-й ступенню — 341 рубель, 3-4-я ступень — 409 рублёў.

Акрамя таго, дзецям-інвалідам да 18 гадоў прызначаецца сацыяльная пенсія, памер якой залежыць ад ступені страты здароўя і вагаецца ад 80 да 110 % БПМ і складае ад 273 да 375 рублёў. Такім чынам, пры выхаванні ў сям'і дзіцяці з інваліднасцю да трох гадоў сумарны працэнт выплат пенсій і дапамог складзе прыкладна 1,5 тысячы. А пры наяўнасці ў сям'і яшчэ двух дзяцей, старэйшых за тры гады, памеры выплат перавышаюць 1700 рублёў.

— Чым раней бацькі пачынаюць займацца згаданымі пытаннямі, тым хутчэй дзяржава падхоплівае сям'ю і дапамагае, — адзначае Наталля Ігнатовіч. — Гэта некалькі відаў дапамог, пачынаючы ад сацыяльнай пенсіі дзіцяці, дапамог па доглядзе ў залежнасці ад колькасці дзяцей. Акрамя таго, час, калі маці выхоўвае дзіця-інваліда, уваходзіць у агульны стаж пры фарміраванні пенсіі.

Ёсць і такі від падтрымкі, як адрасная сацыяльная дапамога, а гэта чатыры віды дапамог: штомесячная, аднаразовая, дапамога на набыццё сродкаў гігіены, забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця. Аказваюцца паслугі нянькі і сацыяльная перадышка. Летась, дарэчы, у Мінскай вобласці паслугамі нянькі скарысталіся 174 сям'і.

Паслуга сацыяльнай перадышкі аказваецца з 2013 года. Спецыялісты развіваюць у дзіцяці навыкі, у тым ліку па сацыялізацыі, кантактаванні з равеснікамі. Паслуга аказваецца дамамі-інтэрнатамі на тэрмін да 56 дзён у год, але не больш за 28 дзён запар на бясплатнай аснове за выключэннем харчавання.

Слова бацькам

«КОЖНЫ ДЗЕНЬ У СТРЭСЕ»

— Майму сыну Дзмітрыю 31 год, ён не размаўляе, не піша, мае аўтыстычныя асаблівасці развіцця, — расказвае **старшыня грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам» Алена ЦІТОВА.** — Як мама я сама штодзённа сутыкаюся з многімі пытаннямі, але магу канстатаваць, што ў апошнія гады адбыўся сапраўды вялікі прарыў у медыцыне, адукацыі, сацыяльнай абароне. Аднак бацькі, нягледзячы нават на такую падтрымку, кожны дзень знаходзяцца ў цяжкім стане і стрэсе, прычым менавіта з дарослымі людзьмі. Людзі, якія перасоўваюцца ў інвалідным крэсле, з глухатой ці слепатой, маглі б самі расказаць, як яны жывуць і ў чым маюць патрэбу. І дзіця, і дарослы чалавек з аўтызмам не зможа прадставіць сябе і нават не зможа зайсці ў гэты пакой, бо гэта новая абстаноўка. Калі для звычайнага чалавека няпроста выступіць перад мікрафонам, то ў чалавека з аўтызмам гэтае напружанне ўзрастае шматкратна. Бацькам такіх людзей вельмі патрэбна дапамога, яна мусіць быць штодзённай, асабліва што датычыцца сацыяльнай сферы, бо толькі сям'я можа падтрымліваць чалавека з РАС штодзённа і пастаянна.

Звяртаючыся да ўсіх, адзначу, як важна разумець асабістую прастору чалавека з аўтызмам. Калі вы сустракаеце такога чалавека ў кафэ ці магазіне з неадэкватнымі паводзінамі, як гэта часта трактуецца, трэба даць яму магчымасць сысці са шматлюднага месца і выдзеліць асобны пакой. Гэта сапраўды зніжае ўзровень трывогі і непакою. Такім людзям жыццёва неабходная цішыня. Гукі свідравання ў суседзяў могуць выклікаць жах і паніку, і ніякая «хуткая» не дапаможа. Рашэнне праблемы ёсць — навушнікі, часам незвычайныя, у якіх не чуваць пабочныя гукі, — людзей з імі часта можна сустрэць у горадзе. Важныя і прадметы, каб заняць рукі. Усе мы часам штосьці перабіраем у руках, не аддаючы гэтаму ўвагі. Каб зняць напружанне, чалавеку з аўтызмам часам вельмі важна штосьці мець у руках.

І апошняе, на што хачу звярнуць увагу. Мы, бацькі, хочам, каб нашы дзеці засталіся жыць у тым месцы, той супольнасці, дзе яны прызвычаіліся. Для чалавека з аўтызмам пераезд у інтэрнат раўназначны смерці. Прывяду просты прыклад: усе мы былі ў санаторыі, але задайце сабе пытанне: ці хацелі б вы пражыць там усё жыццё?

«З ГЭТЫМ ЦЯЖКА ЗМІРЫЦЦА»

— Майму сыну цяпер 10 гадоў, мы сутыкнуліся з усім спектрам праблем, — расказвае **Валянціна ІВАНОВА.** — Дыягностыка сапраўды мусіць быць ранняй. З намі, напрыклад, да трох гадоў спецыялісты нават не размаўлялі. Да таго ж мы жывём у сельскай мясцовасці, да ўрачоў даехаць няпроста: здаць аналізы трэба ў адным населеным пункце, паехаць да спецыяліста ў іншы. Калі Вася быў маленькі, гэта было надзвычай складана: чакаць з ім аўтобус на прыпынку было немагчыма.

Дыягназ яму паставілі ў чатыры гады. На аўтызм нас не тэсціравалі, выставілі разумовую адсталасць з цяжкім паводзінскім расстройствам. Апошняе выяўлялася ў тым, што, заходзячы ў новае памяшканне ці бачачы новага чалавека, ён выгінаўся, затыкаў вушы і крычаў. У пяць гадоў у наш раён прыйшла маладая ўрач-псіхіятр і засумнявалася ў моцнай разумовай адсталасці сына, яна звычайна відаць па твары. А ў Васі па твары не відаць нічога. Яна накіравала нас на тэсціраванне ў абласную бальніцу. Там нам паставілі аўтызм. Мяркую, што ўмераная разумовая адсталасць застанецца, бо аўтызм перашкаджае развівацца ва ўсіх астатніх сферах.

Справа была не толькі ў тым, што сын не размаўляе. Цяпер ён, дарэчы, размаўляе — адказвае па шаблонных фразах, як яго завуць, дзе ён жыве, як клічуць сабаку. У Васі тонус у нагах, ён ходзіць на дыбачках. Для мяне цішыня, а ён затыкае вушы, выгінаецца і крычыць. Плюс праблемы са сном, выбіральнасць у ежы. Гэта складана, калі ты спіш 1,5-2 гадзіны, потым супакойваеш крыкі і ўвесь час думаеш, чым яго накарміць. Мы пайшлі да платнага неўролага. Яна растлумачыла, чаму ён затыкае вушы і крычыць: мозг няправільна апрацоўвае акустычную інфармацыю, і ў яго ў галаве какафонія. Яна парэкамендавала Тамаціс-тэрапію, мы прайшлі тры курсы, і гэтага хапіла. Мы пачалі ездзіць на тралейбусе, раней тое было немагчыма. Акрамя таго, нам адмянялі прэпараты, якія прымаліся раней.

Мне было цяжка змірыцца, што ў мяне такое дзіця. Гэта вельмі цяжка прыняць. Дапамагло, калі сын атрымаў інваліднасць і мы паехалі ў рэабілітацыйны цэнтр на Нарач. Там я ўбачыла такіх жа маці, і зразумела, што я не адна, нам ёсць пра што пагаварыць і можна падзяліцца інфармацыяй. Напрыклад, як вырашыць праблему са сном, мне параіла іншая мама. Я пашыла цяжкую коўдру, і Вася стаў нармальна спаць.

З таго часу, як ён стаў спаць і адмянілі некаторыя прэпараты, ён стаў больш уважлівым, лепш пайшло навучанне, маўленне. На дыбачках ён па-ранейшаму ходзіць, але калі сталі прымяняць іпатэрапію, ён злазіць з каня і тры-чатыры метры ідзе поўнай ступнёй. Стаў кантраляваць свае ногі. Летась мы выйшлі з надомнага навучання і трапілі ў вельмі добрую Рудзенскую школу-спецінтэрнат, у нас ёсць цьютар, якую Вася адразу прыняў.

Выпадкова ў сына выявілася цяга да музыкі. Я чытала, што ўсе дзеці з аўтызмам таленавітыя, і думала: значыць, трэба шукаць. Хадзілі на гімнастыку, малаванне, лепку. Выпадкова выявілася цікавасць да піяніна. Ён уставаў у дзве, чатыры гадзіны ночы і з часам навучыўся лавіць нейкія рытмы. Мы знайшлі настаўніцу, якая пачала з ім займацца. За год заняткаў ён навучыўся іграць гамы і цэлыя творы. Яго прынялі ў музычную школу, не чакаючы пачатку наступнага навучальнага года. Вася іграе ў школьных канцэртах, не баіцца выступаць на людзях. Калі побач ёсць клавішны інструмент, гэта яго супакойвае. Калі некуды едзем, бяром з сабой сінтэзатар.

ІЛАН МАСК СТАВІЦЬ НА КІТАЙ ПА-БУЙНОМУ

Tesla пабудуе ў Шанхаі яшчэ адну мегафабрыку

Нягледзячы на моцны ціск Белага дома, амерыканскі бізнес не спяшаецца адмаўляцца ад перспектыўнага кітайскага рынку.

Яшчэ адным пацвярджэннем ісціны, што вайна вайной (тэхналагічная і гандлёвая), а бізнес па раскладзе, стала паведамленне аб тым, што Ілан Маск і Tesla збіраюцца пабудаваць ва ўпадабаным Шанхаі, дзе ўжо маецца мегафабрыка па зборцы электрамабіляў, яшчэ і мегафабрыку па вытворчасці акумулятараў для іх, а таксама сістэм захоўвання энергіі Megapack (магутных модульных батарэй, выкарыстанне якіх дапамагае стабілізаваць энергасістэму і прадухіляць адключэнні электрычнасці), паведаміў expert.ru. Цырымонія падпісання пагаднення аб будаўніцтве мегафабрыкі адбылася днямі ў фінансавай сталіцы Паднябеснай. «Наша наступная мегафабрыка будзе ў Шанхаі, — паведамляецца ў заяве Tesla на Twitter. — Яна будзе вырабляць 10 тысяч Megapacks у год». «Tesla пабудуе фабрыку па вытворчасці Megapack у Шанхаі ў дадатак да такой жа фабрыкі ў Каліфорніі», — пацвердзіў гучную навіну сам Ілан Маск.

Аб новай мегафабрыцы пакуль вядома зусім мала. Будаўніцтва ў новым раёне Ліньган шанхайскай пілотнай зоны свабоднага гандлю пачнецца ў трэцім квартале ўжо сёлета. У планах — выпусціць першую прадукцыю ў другім квартале 2024 года. Першапачатковая магутнасць — 10 тысяч батарэй Megapack у год, якія дазваляюць захоўваць каля 40 ГВт•гадз. энергіі. У заяве Tesla адзначаецца, што кожны Megapack здольны захоўваць 3 МВт•гадз. электраэнергіі. Гэтага дастаткова для забеспячэння электраэнергіяй прыблізна 3600 дамоў на працягу адной гадзіны.

Будаўніцтва акумулятарнай мегафабрыкі ў Шанхаі стане выкананнем абяцання Ілана Маска развіваць не толькі вытворчасць электрамабіляў і асваенне космасу, але і аднаўляльныя крыніцы энергіі. Першая мегафабрыка Tesla працуе ў Шанхаі з 2019 года. На ёй збіраюцца найбольш папулярныя мадэлі электрамабіляў — Model 3 і the Model Y. Магутнасць аўтазавода — больш чым 750 аўто ў год. Летась на шанхайскай гігафабрыцы выпусцілі звыш 700 тысяч электрамабіляў — 52 працэнты ўсёй сусветнай вытворчасці.

Кітаю, эканоміка якога аднаўляецца пасля пандэміі, цяпер вельмі патрэбны замежныя інвестыцыі. Паднябесная пачынае зноў станавіцца «Меккай» для буйных бізнесменаў. Дастаткова сказаць, што, акрамя Ілана Маска, у Пекін днямі прылятаў кіраўнік Apple Цім Кук, які сустракаўся, дарэчы, з новым прэм'ерам Дзяржсавета КНР Лі Цянам. Як вядома, кіраўнік урада лічыцца прыхільнікам пашырэння супрацоўніцтва Пекіна з замежнымі кампаніямі.

Кітай — вельмі важны рынак Tesla. Амерыканскі мільярдэр прызнаў, што ён з'яўляецца стратэгічным для яго бізнесу. Па колькасці электрамабіляў, якія прадаюцца, ён на другім месцы. Гэтым разам у Кітай, паведамляе thestreet.com, Маск прыляцеў з Томам Чжу, які раней узначальваў кітайскае падраздзяленне Tesla. Цяпер Том кіруе ў кампаніі вытворчасцю і лічыцца адным з патэнцыяльных зменшчыкаў Ілана Маска.

Як няцяжка здагадацца, да цесных адносін Tesla і, натуральна, самога Маска з Кітаем у Вашынгтоне ставяцца падазрона. Прэзідэнт Байдэн у лістападзе мінулага года шматзначна заявіў, што супрацоўніцтва кіраўніцтва кампаніі з замежнымі дзяржавамі заслугоўвае ўвагі.

У пачатку сакавіка Ілан Маск абвясціў няхай і даволі туманныя планы па развіцці Tesla. Чарговая мегафабрыка па зборцы электрамабіляў будзе будавацца на поўначы Мексікі, у раёне Мантэрэя.

СТАРЫ СВЕТ ЧАКАЕ ЯШЧЭ АДЗІН ГОД МОЦНАЙ ЗАСУХІ

Аўтары даклада ААН, апублікаванага да Канферэнцыі па водных рэсурсах, папярэджваюць аб хуткім росце спажывання вады ў свеце і магчымым з-за гэтага крызісе.

У дакладзе адзначаецца, што асноўная доля росту спажывання водных рэсурсаў прыпадзе на краіны з сярэднім і нізкім узроўнем даходу, у прыватнасці на краіны з рынкавай эканомікай, якая фарміруецца, паведаміў Euronews. Многія з іх, уключаючы тыя, якія цяпер не адчуваюць дэфіцыту вады, вельмі хутка сутыкнуцца з яе недахопам, паведаміла Euronews.

Паводле нядаўняга даследавання, праведзенага Тэхналагічным універсітэтам Граца ў Аўстрыі, Еўропа перажывае засуху з 2018 года. Даследчыкі кажуць, што сітуацыя з водных рэсурсамі зараз «вельмі нестабільная». Краіны па ўсім кантыненце адчуваюць цяжкасці з вадой нават зімой. З-за малой колькасці ападкаў у выглядзе дажджу і снегу і без таго невялікія запасы вады не былі адноўлены ў гэты звычайна вільготны перыяд.

У паўночнай Італіі, Францыі і Іспаніі сітуацыя «выклікае апасенні наконт водазабеспячэння насельніцтва, сельскай гаспадаркі і вытворчасці энергіі», гаворыцца ў апошнім дакладзе Аб'яднанага даследчага цэнтра ЕС (АДЦ) аб засухах у Еўропе.

У дакументе падкрэсліваецца, што Еўропа і Міжземнаморскі рэгіён могуць зазнаць сёлета яшчэ адно экстрэмальнае лета. Еўракамісія мяркуе, што хуткія летнія месяцы могуць быць яшчэ больш засушлівымі, чым у папярэднія гады, і ападкі ў найбліжэйшыя тыдні будуць мець вырашальнае значэнне.

Навукоўцы папярэдзілі Еўропу аб пагражальнай катастрофе з-за змяншэння запасаў падземных вод. Пра гэта сведчаць вынікі даследавання, апублікаванага ў навуковым часопісе Geophysical Research Letters, паведамляе The Independent. Адзначаецца, што ў летнія месяцы 2018 і 2019 гадоў у Еўропе назіраўся востры недахоп вады па прычыне засухі. З таго часу ўзровень грунтавых вод застаецца нізкі. Чарговы раз анамальна спякота і засуха фіксаваліся ў Еўропе ў 2022 годзе, наступствамі чаго сталі моцныя пажары, абмяленне рэк, пагаршэнне якасці паветра.

Даследчыкі канстатуюць, што засуха наносіць істотны ўрон прыродзе і сельскай гаспадарцы. Акрамя таго, у выніку засухі ў Еўропе навідавоку дэфіцыт электраэнергіі. Так, з-за недастатковай колькасці астуджальнай вады атамныя электрастанцыі ў Францыі з цяжкасцю маглі выпрацоўваць неабходную колькасць электраэнергіі. Дэфіцыт вады адбіўся і на дзейнасці гідраэлектрастанцый, стварыўшы для іх значныя праблемы.

Навукоўцы падкрэсліваюць, што сітуацыя з вадой у Еўропе цяпер вельмі небяспечная. «Некалькі гадоў таму я ніколі не падумаў бы, што вада можа стаць праблемай тут, у Еўропе, асабліва ў Германіі ці Аўстрыі», — прызнаецца адзін з даследчыкаў доктар Торстэн Маер-Гюр. Ён заклікае еўрапейскіх лідараў сур'ёзна паставіцца да гэтай праблемы і прыняць неабходныя меры для мінімалізацыі наступстваў.

НАЙБАГАЦЕЙШЫЯ КРЫПТАМІЛЬЯРДЭРЫ СТРАЦІЛІ ЗА ГОД ЗВЫШ 75 ПРАЦЭНТАЎ КАПІТАЛУ

Капіталы найбагацейшых людзей са свету крыптавалют за год зменшыліся больш чым на 110 мільярдаў долараў. Летась Forbes назваў 19 найбагацейшых крыптамільярдэраў планеты, чые багацці разам складалі каля $140 млрд. Цяпер іх капіталы ацэньваюцца менш чым у $30 млрд, а 10 удзельнікаў спісу перасталі быць мільярдэрамі.

Мацней за ўсё пацярпеў заснавальнік крыптабіржы FTX Сэм Бэнкман-Фрыд, які летась заняў другое месца ў рэйтынгу з капіталам $24 млрд. З тых часоў FTX падала заяву аб банкруцтве, а яе стваральніку пагражае пажыццёвае зняволенне па абвінавачванні ў махлярстве і іншых фінансавых злачынствах. Капітал Бэнкмана-Фрыда, паводле ацэнкі выдання, цяпер складае менш чым $10 млн (раней — $24 млрд).

Рынкавы кошт крыптавалют за 12 месяцаў да сакавіка 2023 года знізіўся на $700 млрд, а ўслед за ім абрынуліся і ацэнкі многіх крыптавалютных стартапаў, піша Forbes. Турбулентнасць на крыптарынку, якая пачалася мінулым летам з краху хедж-фонду Three Arrows Capital і дасягнула кульмінацыі ў лістападзе з банкруцтвам FTX, прыцягнула павышаную ўвагу амерыканскіх рэгулятараў, што яшчэ больш насцярожыла інвестараў. У выніку абвал крыптавалютнага рынку закрануў усіх удзельнікаў.

Першае месца ў абноўленым рэйтынгу па-ранейшаму займае стваральнік і гендырэктар найбуйнейшай крыптабіржы свету Binance Чанпэн Чжаа. Але яго багацце, якое летась ацэньвалася ў $65 млрд, цяпер складае $10,5 млрд, а ў амерыканскіх улад узніклі пытанні да Binance. Напрыканцы сакавіка іск да платформы і яе заснавальніка падала Камісія па гандлі таварнымі ф'ючарсамі ЗША, заявіўшы, што Binance не зарэгістравалася як платформа, якая гандлюе крыптавалютнымі дэрыватывамі.

